незалежная газета

№ 19 (617) 20 мая 2009

www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Заснаваная ў лістападзе1906. Адноўленая ў траўні 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыднёва, у серады



## Маленькія радасці вялікіх дзядзечак

Старонка 3

## Алег Хаменка: З чыноўнікамі можна дамаўляцца

Старонка 9





### У НУМАРЫ

**Множнасць курсаў валюты: няма дыму без агню**

Тыдзень пачаўся з абмежавання продажу валюты для прадпрыемстваў. **Старонка 4.**

**За ўсё плачу!**

«НН» падлічыла, колькі каштуе сярэднестатыстычнаму мінчаніну рэалізацыя праектаў і ідэй Мінгарвыканкаму. **Старонка 6.**

**Проста кантракт такі**

Даследаванне Беларускага інстытуту стратэгічных даследаванняў і сацыялагічнай лабараторыі «Новак» ламае стэрэатып пра беларусаў як пра нейкую асаблівую нацыю «лагодных» і «памяркоўных». **Старонка 7.**

**Звацца Юдам забаронена**

Піша Наталка Бабіна, што пабывала ў Берліне ў музеях Штазі і Берлінскай сцыны. **Старонка 12.**

**Пра што крык?**

Альтэрнатыўная гісторыя — у рамане Людмілы Рублеўскай «Забіць нягодніка, альбо Гульня ў Альбарутэнію». Піша Даніла Жукоўскі. **Старонка 13.**


# На кручку ў Рыбака

**апынуўся цэлы кантынент. Беларусы ж адчулі сапраўдны гонар за далёкага суродзіча і задумаліся пра тое, што такое нацыянальная ідэнтычнасць.**

У фінале конкурсу «Еўрабачанне-2009» пераможцам стаў нарвежскі беларус Аляксандр Рыбак, якому 13 мая споўнілася 23 гады. Пры гэтым наш зямляк паставіў рэкорд конкурсу, атрымаўшы перамогу з велізарным адрывам. Ён набраў 387 балаў — яшчэ нікога ў гісторыі «Еўрабачання» так шчодра не адорвалі баламі. Ісландыя заняла другое месца з 218 баламі.

На прэс-канферэнцыі, прысвечанай перамозе ў фінале конкурсу «Еўрабачанне», Аляксандр падкрэсліў, што сам напісаў музыку і словы да песні «Fairytale» і што гэты факт, магчыма, і дапамог яму перамагчы. «Дзякуй Беларусі за 12 балаў», — сказаў пераможца конкурсу еўрапейскай песні ў першыя хвіліны прэс-канферэнцыі. І дадаў, што наведаецца ў Беларусь з гастролямі. У шматлікіх кантактах з прэсай хлопец неаднаразова падкрэсліваў сваё паходжанне, адно што ў беларускіх рэаліях, ён, гледзячы па ўсім, арыентуецца досыць слаба. У адной з гутарак ён сказаў, што ягоная сям'я не прыязджае ў Беларусь, бо баіцца, што дыктатура не выпусціць іх назад.

У Нарвегіі Рыбака сустракалі як нацыянальнага героя. У аэрапорце сабраліся тысячы нарвежцаў, у тым ліку прэм'ер-міністр Нарвегіі Енс Столтэнберг, які перамогу на Еўрабачанні назваў вялікім поспехам яго краіны. «Казка» Рыбака гучыць гэтымі днямі не толькі на галоўным пляцы Осла, але і ў гіпермаркетах. Нават тыя, хто не церпіць папсы, адчуваюць гонар за нацыю.

**Працяг на старонцы 2.**



**Статыстыка «Еўрабачання-2009»**

Аляксандр Рыбак набраў нечуваныя 387 балаў.

Па 12 балаў нарвежскаму беларусу паставілі: Беларусь, Іспанія, Германія, Швецыя, Ісландыя, Ізраіль, Расія, Латвія, Літва, Украіна, Польшча, Нідэрланды, Эстонія, Данія, Славенія, Венгрыя — усяго 16 краін. Сярэдні бал — 9,44.

Як галасавала Беларусь: Нарвегія (12), Азербайджан (10), Расія (8), Францыя (7), Украіна (6), Грэцыя (5), Эстонія (4), Вялікабрытанія (3), Ісландыя (2) і Арменія (1). Праўда, адзін з сяброў беларускага журы, Сяргей Маліноўскі, выказаў неўразуменне баламі Расіі — з ягоных словаў, журы не паставіла ёй ніводнага бала, адкуль жа ўзяўся вынік? Такі сама скандал вынік ва Украіне.

Вынікі ўсіх фіналістаў: Нарвегія — 387, Ісландыя — 218, Азербайджан — 207, Турцыя — 177, Вялікабрытанія — 173, Грэцыя — 120, Францыя — 107, Боснія — 106, Арменія — 92, Расія — 91, Украіна — 76, Данія — 74, Малдова — 69, Партугалія — 57, Ізраіль — 53, Албанія — 48, Харватыя — 45, Румынія — 40, Германія — 35, Швецыя — 33, Мальта — 31, Іспанія, Літва — 23, Фінляндыя — 22.

Пятро Ялфімаў аказаўся па выніках паўфіналаў на 32-м месцы.

# Прадалі Расіі долю?

**Звесткі Белстату дазваляюць выказаць меркаванне, што ў сакавіку 2009 году Беларусь сакрэтна прадала Расіі долю ў адным з трубаправодаў.**

У звестках Белстату праскочыла цікавая лічба: за першы квартал у Беларусь надышло 1 076 994,7 тыс. даляраў наўпростых замежных інвестыцыяў у транспарт (уключаючы трубаправоды). Сфера транспарту пераважна кантралюецца дзяржавай, і надыход такіх значных — наўпростых — інвестыцыяў павінен быў бы стаць шырока вядомым. Дзяржаўныя СМІ павінны былі б гаварыць пра поспехі ў прыцягненні інвестыцыяў і т.п. Між тым не прагучала ніводнага слова, акрамя вось гэтага радка ў статыстыцы.

Калі ў 2007 годзе з малатка пайшоў мабільны аператар «Вэлкам», краіна пра тое даведалася толькі постфактум. Радок у статыстыцы Белстату дазваляе выказаць меркаванне, што ў сакавіку 2009 Беларусь гэтаксама сакрэтна прадала ці дадатковую долю ў «Белтрансгазе», ці долю ў нафтаправодзе «Дружба».

Афіцыйныя СМІ паведамлялі, што ў лютым Беларусь атрымала $625 млн за чарговыя 12,5% акцыяў «Белтрансгазу», і Расія тым самым павялічыла сваю долю ў прадпрыемстве з 25% да 37,5%. Тады за што атрымалі яшчэ 450 млн? Больш за тое, калі прыгледзецца да статыстыкі 2008 году, дык пабачым, што леташні транш у 625 млн ніяк не быў адлюстраваны ў графе «інвестыцыі ў транспарт». Па логіцы, не павінен быў трапіць у яе і трэці транш. У такім разе няяснай застаецца паходжанне ўсёй сумы — мільярд з гакам даляраў.

**Працяг на старонцы 5.**



**Сем мінскіх школаў прапануюць навучанне на беларускай мове**

Інфармацыя, адрасы і кантакты. **Старонка 15.**

«Наша Ніва» з'яўляецца ў кіёсках у Мінску ў сераду ад абеду, у рэгіёнах — у чацвер. На газету можна і падпісацца — глядзі **старонку 2**.




# На кручку ў Рыбака

Працяг са старонкі 1.

Поспех суродзіча безумоўна страпянуў і беларусаў. У Беларусі ягоная перамога справакавала безліч публікацыяў у прэсе як дзяржаўнай, так і незалежнай. Хіба што ў незалежнай прэсе побач з радасцю за ўдачу земляка часта гучыць шкадаванне ад таго, што на радзіме дагэтуль таленты куюцца іншымі спосабамі. Найбольш скептычна настроеныя суайчыннікі задаюцца пытаннем — а што беларускага ў Рыбака акрамя ягонай крыві, каб так ганарыцца ягоным поспехам? Нібы папярэджваючы скептыкаў, у Маскве Рыбак напеў «Купалінку».

Паказальна тое, што да перамогі Рыбака ў адборачным конкурсе ў Нарвегіі ў лютым, на радзіме пра яго амаль нічога не ведалі. Ягоныя поспехі на тэатральнай сцэне, роля ў кіно, прэстыжныя прэміі ды сумесны праект з музыкам «A-ha» прайшлі міма беларускіх СМІ. І толькі тое, што на «Еўрабачанне-2009» едуць два беларусы, і адзін з іх будзе выступаць не за Расію, зрабіла вядомым Рыбака ў нас. Ягоны шлях да перамогі адсочваўся ці не больш пільна, чым удзел у конкурсе Пятра Ялфімава.

**Сямён Печанко**

### ARCHE ў Гродне

**28 мая ў Гродне ў памяшканні Таварыства беларускай школы (вул.-Будзённага, 48а-44)** пройдзе прэзентацыя спецыяльнага нумару часопісу ARCHE, прысвечанага БНР. Удзел бяруць рэдактар часопіса Валер Булгакаў, а таксама гісторыкі Алесь Пашкевіч і Андрэй Чарнякевіч. **Пачатак у 18.30.**

# Кніга аб мужнасці

У кніжнай серыі радыё «Свабода» з'явілася новае выданне — «Адзін дзень палітвязня». Кніга сабрала пад адной вокладкай гісторыі палітычна матываваных зняволенняў ад 1996 да 2008 гадоў, ад Славаміра Адамовіча да Сяргея Парсюкевіча.

Усяго ў кнізе 41 герой. У агульнай колькасці ўсе яны разам правялі за кратамі больш за 53 гады. Пра некага, як Уладзіміра Лыска ці Вадзіма Кабанчука, амаль усе паспелі забыцца, а за турэмнымі буднямі Дашкевіча і Казуліна мы сачылі зусім нядаўна.

Уражвае, наколькі розныя людзі траплялі за краты праз свае палітычныя погляды за часамі кіравання Лукашэнкі — прэм'ер-міністр Чыгір, міністр Лявонаў, дыпламат Марыніч, журналісты Мажэйка і Маркевіч, дырэктар калгасу Старавойтаў, мастак Кійко, прадпрымальнікі Леванеўскі і Васільеў.

Ніхто з іх не наракае, што прайшоў праз турэмныя ўніверсітэты. Ніхто не адмаўляецца ад перакананняў, за якія трапілі на нары. Кожны расказвае пра тое, што турма навучыла яго вытрымцы, спакою, трываласці. Многія з іх выйшлі з турмы маральнымі аўтарытэтамі.

Працяг на старонцы 5.

# Другі месяц галадоўкі Мікалая Аўтуховіча

16 траўня пачаўся другі месяц бестэрміновай галадоўкі пратэсту ваўкавыскага прадпрымальніка Мікалая Аўтуховіча, які ад 8 лютага знаходзіцца за кратамі па падазрэнню ў падпалах і падрывах дамоў чыноўнікаў.

Аўтуховіч патрабуе ў самыя кароткія тэрміны перадаць справу ў суд або змяніць усім падследным (а гэта яшчэ Юры Лявонаў і Уладзімір Асіпенка) па гэтай справе меру стрымання з утрымання пад вартай на падпіску аб нявыездзе. У аўторак Мікалая перавялі ў Рэспубліканскую бальніцу МУС.

15 мая галадоўку салідарнасці з ваўкавыскімі прадпрымальнікамі спынілі юнакі, якія не ўжывалі ежу цягам дванаццаці дзён. У гэтай акцыі салідарнасці ўзялі ўдзел 32 чалавекі.

«Мы заяўляем, што зробім па дыпламатычных каналах усё магчымае, каб увага да справы ваўкавыскіх прадпрымальнікаў не слабела», — заявіў у дзень спынення маладафронтаўскай галадоўкі лідэр Руху за Свабоду Аляксандр Мілінкевіч.

19 мая Мікалая Аўтуховіча ў сувязі з пагаршэннем стану здароўя перавялі з СІЗА ў Рэспубліканскую бальніцу МУС.

**ЗП**


# Не ўсё ў жыцці апошні раз

**Падпісацца можна праз Рэдакцыю і праз «Белпошту». Мы рэкамендуем — праз Рэдакцыю**

Цана падпіскі праз Рэдакцыю на месяц складае **6000 рублёў**.

Наша сістэма дастаўкі газеты за 3 гады даказала сваю надзейнасць. Усе тыя, каго такі спосаб атрымання газеты задавальняе, хай застаюцца вернымі такой падпісцы.

Мы зможам дастаўляць Вам газету хутчэй або з той жа хуткасцю, што «Белпошта».

Падпісныя індэксы ў каталогу «Белпошты»: для людзей — **63125**, для прадпрыемстваў — **631252**. Падпісацца можна на кожнай пошце. Цана гэтай падпіскі — 12 000 руб. на месяц.

ПАВЕДАМЛЕННЕ

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828
МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Мінск, код 764

Рахунак атрымальніка: 3012 206 280 014 — Асабовы рахунак

(прозвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газету "Наша Ніва" | | | | | |

Агулам

Касір

КВІТАНЦЫЯ

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828
МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Мінск, код 764

Рахунак атрымальніка: 3012 206 280 014 — Асабовы рахунак

(прозвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газету "Наша Ніва" | | | | | |

Агулам

Касір М.П.

**Каб штотыдзень атрымліваць газету,**

дасылайце адрасы і грошы за газету. Кошт на месяц — 6 тыс. рублёў.

1) Просім усіх ахвотных чытаць газету **паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз:** тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32, (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@nn.by, паштовы адрас: 220050, г.Мінск, а/с 537.

2) **Просім у бланку банкаўскага паведамлення ці паштовага перараказу дакладна і разборліва пазначаць адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад'езду.**


Тры гады «НН» можна было атрымаць толькі падпісаўшыся праз Рэдакцыю. І мы завялі традыцыю дзякаваць усім тым чытачам, якія пералічваюць грошы на выхад газеты.

### Дзякуй

**Ю.Ж., Іне С., Алене Г.** з Барысаўскага раёну.
**Валянціне Ш., Л.Г., З.А., А.Л., Сямёну Л., Вользе Ш., Ніне Ш., Ігару Б., Дз. Я., В.Б., П.Ч., Р.П., Д.К., В.Л., Алегу М., Г.С., Аляксандру С., Івану С., А.Дз., Валянціне Дз., В.Л., Генадзю Ш., Георгію П., С.Ц., І.Б., І.С., Тацяне В., Алегу Т., Тамары Л., Галіне Ж.** з Мінску.
**Тамары К.** з Смалявіцкага раёну.
**Юрыю Ю.** з Маладзечанскага раёну.
**Паўлу С.** з Горацкага раёну.
**Антаніне К.** з Крупскага раёну.
**Л.Ш.** з Віцебску.
**Д.Д.** з Лагойскага раёну.

# ПКБ ператворыцца ў «Справядлівы свет»

**23 мая ў ДК Мінскага трактарнага заводу адбудзецца XIV пазачарговы з’езд Партыі камуністаў Беларускай.**

Пленум ЦК ПКБ прыняў рашэнне, што з’езд пройдзе ў два этапы. Першы адбудзецца 23 мая, а другі — у верасні ці кастрычніку.

«Найперш будзе разгледжанае пытанне даверу да Цэнтральнага камітэту партыі, а таксама асабіста да старшыні Сяргея Калякіна. Справа ў тым, што некаторыя сябры партыі выказалі недавер да цяперашняга кіраўніцтва. Далей плануецца разгляд варыянтаў новай назвы партыі. Толькі 9 з 49 сяброў ЦК прагаласавалі за пакіданне старой назвы», — кажа С.Вазняк.

На дадзены момант існуюць шэсць варыянтаў новай назвы для ПКБ: «Беларуская партыя левых» (БПЛ), Партыя дэмакратыі і справядлівасці (ПДС), Партыя «Новы курс», Партыя «Радзіма», Партыя «Справядлівасць і народаўладдзе» (ПСН), Партыя «Справядлівы свет».

Калі з’езд усё ж прыме рашэнне аб змене назвы, то з шасці варыянтаў будуць абраныя толькі тры, якія і будуць выстаўленыя на галасаванне падчас другога этапу з’езду.

Мы запыталіся ў лідэра ПКБ Сяргея Калякіна, дзеля чаго партыі трэба мяняць назву. «Так захацелі сябры ПКБ. Аргументы прыхільнікаў пераназову мяне пераканалі. На жаль, сёння слова «камунізм» не заўсёды станоўча ўспрымаецца. Сваю ролю тут адыграла і прапаганда, і часы кіравання КПСС. Апусціўшы слова «камуністычны», мы здымем адзін з бар’ераў для ўступлення ў нашу партыю новых людзей», — кажа С.Калякін.

Разам з тым лідэр ПКБ падкрэслівае, што змена назвы не азначае адхіленне ад ранейшых поглядаў. Асабіста Калякіну найбольш падабаецца варыянт — Партыя «Справядлівы свет».

Таксама на з’ездзе будзе разгледжаны праект новага статуту партыі і Антыкрызісная платформа АДС. Новы статут дазваляе ствараць унутры ПКБ асобныя платформы. «Да прыкладу, гэта могуць быць жаночая, моладзевая, марксісцкая платформы», — кажа прэс-сакратар.

У працы з’езду мяркуецца ўдзел 210 дэлегатаў, па 30 ад Мінску і кожнай з абласцей.

З’езд пройдзе ў закрытым рэжыме. На яго будуць запрошаныя толькі прадстаўнікі Мін’юсту, не будзе журналістаў, замежных дэлегацыяў, гасцей. «Гэта робіцца для таго, каб дыскусія была больш разняволенай», — падсумоўвае С.Вазняк.

**Зміцер Панкавец**



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Сяргей Сідорскі, Юры Жадобін і Віктар Лукашэнка — кожны ў сваім амплуа.**

# Маленькія радасці вялікіх дзядзечак

19 мая ў Мінску ў павільёне «Белэкспа» адкрылася міжнародная выстава зброі і вайсковай тэхнікі Milex-2009. Падобнае мерапрыемства праходзіць у Мінску ўжо пяты раз.

Плануецца, што Milex-2009 наведаюць прадстаўнікі міністэрстваў абароны Украіны, Таджыкістану, Судану, Арменіі, Турцыі, усяго 26 краінаў.

На адкрыцці выставы кіраўнік ураду Сяргей Сідорскі выказаў упэўненасць, што беларуская зброя складзе здаровую канкурэнцыю на рынку замежных аналагам. Усяго на выставе будзе 145 экспанатаў, сярод якіх 110 беларускія.

Упершыню беларускія вытворцы прадставілі на выставе сродкі электроннай выведкі.

Напачатку 2000-х Беларусь знаходзілася ў дзесятцы найбуйнейшых экспарцёраў зброі ў свеце. Апошнія гады рэйтынг троху ўпаў. Напрыклад, па афіцыйных звестках за 2007 наша краіна прадала зброю толькі ў тры краіны — Арменію, Эрытрэю і Судан.

Гэта толькі тое, што было задакументавана. Нярэдка ж беларуская зброя выплывала ў зусім незвычайных сітуацыях. Па звестках Калумбіі, прэзідэнт Венесуэлы Чавэс спрабаваў узброіць калумбійскіх паўстанцаў з дапамогай беларускай зброі.

Дарэчы, апроч Сідорскага выставу наведалі дзяржаўны сакратар Рады Бяспекі Юры Жадобін, а таксама старэйшы сын Лукашэнкі Віктар. Усе трое былі ў добрым настроі і шмат усміхаліся.

У сферы абароны і ўзбраенняў Беларусь застаецца намоцна прывязанаю да Расіі. У часе выставы Milex-2009 генеральны дырэктар кампаніі «Расабаронэкспарт» Анатоль Ісайкін паведаміў, што цяпер ідуць перамовы і консультацыі аб набыцці Беларуссю ў Расіі комплексаў супрацьпаветранай абароны «Тор» і найноўшых мадыфікацый «Бук».

Пры гэтым гендырэктар «Расабаронэкспарту» не стаў адказваць на пытанне аб тым, на працягу якога часу пасля прыняцця палітычнага рашэння ў Беларусь могуць быць пастаўлены магутныя аператыўна-тактычныя ракетныя комплексы «Іскандэр» і суперсучасныя сістэмы СПА С-400 «Трыумф». Пры гэтым ён зазначыў, што С-400 могуць быць пастаўлены на льготнай аснове.

**ЗП; Вячаслаў Будкевіч, БелаПАН**

# Краўчанка знайшоўся

**«Прабачце, але я гэта ніяк не каментую. Палітыкай я не займаюся». — «А чым займаецеся, бо апошнім часам ваша імя нідзе не фігуруе?» — «Я не буду адказваць на гэтае пытанне».**

Апошнім часам актывізаваўся былы міністр замежных справаў, а за Лукашэнкам — пасол Беларусі ў Японіі Пятро Краўчанка.

Прычым звон пра яго даходзіць з розных партыяў. Спачатку з БСДП, потым — з БНФ. У абодвух выпадках гаворкі вядуцца пра тое, што Краўчанка хоча ўзначаліць гэтыя структуры.

Кіраўніцтва сацыял-дэмакратаў прызнае, што Пётр Кузьміч меў у рэгёнах некалькіх сустрэчаў з актывістамі партыі. Партыя і людзі Краўчанку патрэбныя для ўдзелу ў наступных прэзідэнцкіх выбарах.

Нам атрымалася датэлефанавацца да Пятра Краўчанкі: «Прабачце, але я гэта ніяк не каментую. Палітыкай я не займаюся». — «А чым займаецеся, бо апошнім часам ваша імя нідзе не фігуруе?» — «Я не буду адказваць на гэтае пытанне».

Пётр Краўчанка быў першым міністрам замежных справаў пасля здабыцця незалежнасці. Быў дэпутатам Вярхоўнага Савету. Ад 1998 па 2002 гады з’яўляўся пасломБеларусі ў Японіі.

Пасля пакідання дыпламатычнай пасады пэўны час працаваў эканамічным кансультантам у Маскве, пасля перайшоў на выкладчыцкую дзейнасць у Беларусі. Прозвішча Краўчанкі называлася часам і ў пералічках патэнцыйных кандыдатаў на прэзідэнцкія выбары -2006. Тады на фінішную прамую палітык не пайшоў.

**ЗП**

## СЦІСЛА

### У Снегіра забралі «гняздо»

Следства арыштавала 5-пакаёвую кватэру і катэдж былога пракурора Мінскай вобласці, — паведаміў агенцтву «Інтэрфакс» адвакат Анатоль Шапялевіч. Паводле абвінавачвання, Снягір атрымаў хабар у выглядзе будаўнічых матэрыялаў ад колішняга дырэктара прадпрыемства «Забудова».

### Кожны дзесяты крэдыт «Прыёрбанку» пратэрмінаваны

Пра гэта паведаміла расійскае выданне gazeta.ru, грунтуючыся на аўстрыйскіх крыніцах.

«Прыёрбанк» належыць аўстрыйскай банкаўскай групе Raiffeisen. Такая ж сітуацыя склалася ў банку Raiffeisen ва Украіне, піша выданне.

### Батура: Рашэнне па Абхазіі не будзе расколваць наша грамадства

«Прызнаваць ці не прызнаваць незалежнасць Абхазіі і Паўднёвай Асеціі — гэта выключна права Рэспублікі Беларусь. У нас цесныя адносіны з абхазскім і паўднёваасяцінскім народамі, якія не патрабуюць пасярэднікаў у чыім-колечы абліччы. Беларусы самі прымуць рашэнне. І гэта будзе рашэнне, якое не расколвае наша грамадства», — заявіў старшыня савету рэспублікі Барыс Батура ў інтэрв’ю агенцтву «Інтэрфакс».

**МБ; ІЖ; ПРАЙМ-ТАСС**

# Множнасць курсаў валюты: няма дыму без агню

**Тыдзень пачаўся з прыкметаў абмежавання продажу валюты для прадпрыемстваў.**

Першы дзень чарговага працоўнага тыдня пачаўся з панікі на ўнутраным валютным рынку. Прайшлі чуткі, што банкі, як дзяржаўныя, так і камерцыйныя, адмовіліся прымаць у сваіх кліентаў-прадпрыемстваў заяўкі на куплю замежнай валюты для аплаты імпартных кантрактаў.

Прычым, гаворка не ішла аб авансавых плацяжах. Чуткі, як паведаміў afn.by, узніклі на той глебе, што асобныя дзяржаўныя банкі пачалі адпраўляць сваіх кліентаў да мясцовых уладаў або ў Міністэрства прамысловасці для ўзгаднення заявак на куплю валюты.

У банкаўскіх колах пацвердзілі, што чуткі паўсталі не на пустым месцы. Спасылкі былі на закрытую пастанову Саўміну і НБ РБ №388 ад 30 сакавіка 2009 году, не зарэгістраваную ў Нацыянальным рэестры прававых дакументаў, і вусную забарону на продаж валюты на БВФБ да 1 чэрвеня, за выключэннем аплаты медпрэпаратаў.

Банкам рэкамендавана задавальняць заяўкі кліентаў на пазабіржавым рынку. Рэакцыя рынку была імгненнай — курс на міжбанку сышоў на ўзровень курсу НБРБ +4%, аднак банкірам нагадалі аб існаванні іншай рэкамендацыі Нацбанку — курс на пазабіржавым рынку не павінен перавышаць узроўню «афіцыйны курс НБРБ + 2%».

Сітуацыя нагадвала лёгкую паніку, і ўсе чакалі тлумачэнняў Нацбанку наконт далейшай палітыкі ўтварэння курсу.

У той жа дзень атрымала распаўсюджанне заява намесніка міністра фінансаў Пятра Жабка пра тое, што беларускі ўрад не бачыць патрэбы ў далейшым замежным надзвычайным фінансаванні для пераадолення эканамічнага крызісу, пакуль попыт на еўрапейскім і расійскім рынках застаецца стабільным.

Цяжка сабе ўявіць пры цяперашніх аб'ёмах экспарту і імпарту, якім чынам урад стачыць канцы з канцамі без дадатковых запазычванняў. Толькі за першы квартал дэфіцыт замежнагандлёвага балансу дасягнуў 1,5 млрд рублёў. Летась за першы квартал аналагічная лічба складала ўсяго 200 млн. Толькі калі адбудзецца далейшае падзенне курсу рубля, імпарт аўтаматычна стане нявыгадным. Але адкрытую дэвальвацыю афіцыйны кіраўнік краіны выключыў. Гэта ўзмацняе імавернасць, што рост курсу будзе сукрытым. Напрыклад, такім, якім ён быў у канцы 1990-х. Тады афіцыйны курс валютаў быў адзін, а рэальны — нашмат вышэйшы. Па афіцыйным курсе валюту набывала пэўнае кола прадпрыемстваў і структураў. Для людзей жа квітнеў чорны рынак.

Калі адміністрацыя Лукашэнкі пойдзе на множнасць валютных курсаў, тады краіна сапраўды зможа абысціся без дадатковых крэдытаў. Абмежаванне продажу валюты на БВФБ вядзе менавіта да гэтага.

У аўторак намеснік старшыні Нацбанку Павал Калавур запэўніў, што Нацбанк новых абмежаванняў на куплю валюты не ўводзіў: «Ніякіх пастановаў па прычыне абмежаванняў продажу валюты на біржы ці пазабіржавым рынку Нацыянальны банк не прымаў. Лістоў падобнага зместу галоўны банк краіны банкам таксама не рассылаў», — падкрэсліў і прэс-сакратар Нацбанку. Тым не менш, агенцтву «Інтэрфакс» у трох банкаў пацвердзілі існаванне вуснага ўказання Нацбанку.

У выніку ў панядзелак аб'ём таргоў на БВФБ аказаўся выключна малы: было прададзена ўсяго 8 млн даляраў, што менш за звычайнае для панядзелка.

**Мікола Бугай**

# Прадалі Расіі долю?

Працяг са старонкі 1 .

Вядома, з выкупу дзесяці фураў нейкай транспартнай кампаніі, скручанай крызісам, мільярду даляраў неназбіраецца. Такі вялікі кошт маюць або «Белтрансгаз», або нафтаправод «Дружба», або Беларуская чыгунка. Апошняя найбольш навідавоку, і яна, бадай, адпадае.

Што да датэрміновага продажу «Белтрансгазу», дык не супадае сума: ні два, ні паўтара. Беларусі няма сэнсу цалкам губляць кантроль над гэтым прадпрыемствам за такія невялікія грошы.

Застаецца нафтаправод.

Апаратар трубаправодаў «Гомельтранснафта Дружба» нечакана трапіў у спіс прадпрыемстваў, адкрытых для прыватызацыі ў 2009-м. Ён абслугоўвае частку нафтаправоду «Дружба», па якім праходзіць 20% экспарту расійскай нафты ў Нямеччыну, а таксама сыравіна для іншых краінаў ЕС. У часе сакавіцкіх перамоваў, калі Лукашэнка і Мядзведзеў бачыліся двойчы на працягу аднаго тыдня, звярнулі на сябе ўвагу словы Лукашэнкі пра зацікаўленасць Беларусі ў супрацоўніцтве з Расіяй у сферы транзіту нафты і газу. Расійская газета «Коммерсант» па выніках тых перамоваў паведаміла, што «літаральна на днях у Мінск адправіцца спадар Сечын [блізкі паплечнік Пуціна, які кантралюе «Роснефть»], які абмяркуе там «супольныя інвестыцыйныя праекты» ўжо ў нафтавай сферы».

Лукашэнкаўская сістэма дзейнічае не празрыста і ў гаспадарчых пытаннях. Пад гэтую закрытасць, якая часам мяжуе з падманам, падведзенае нават ідэалагічнае абгрунтаванне: эканоміка — гэта псіхалагічнае самаадчуванне, таму нам не трэба, каб СМІ нагняталі атмасферу. Аднак у працэсе прыватызацыі непразрыстасць выклікае асаблівыя падазрэнні. Часта яе суправаджаюць адкаты — паслугі палітычнага ці фінансавага характару.

У выпадку пераходу ў расійскія рукі «Белтрансгазу» і нафтаправодаў, увага расійскіх манаполіяў зараз звернецца на нафтаперапрацоўчыя заводы і хімічныя гіганты.

**МБ**

# Мытнікі будуць самі вызначаць, хто перад імі

**А чаўнакі будуць абыходзіць забарону на ўвоз тавараў, едучы праз Расію, дзе ліміт увозу — 1500 еўра.**

Чарговы законапраект па барацьбе з імпартам развівае ранейшыя ініцыятывы ўлады.

Нормы бязмытнага імпарту зніжаныя з 1000 еўра да 200 еўра на чалавека. Як бачна з дыяграмы, такі ж узровень усталяваны ва Украіне. Усходнія ж суседзі далёка наперадзе. Менавіта з гэтым фактам звязаная асноўная «левая» схема, якая дазволіць абысці забарону. Дастаткова ўехаць у Беларусь праз Расію з таварам коштам ад 200 да 1500 еўра.

Мытны камітэт упэўнівае, што стаўленне да турыстаў будзе лагоднае, а праблемы з'явяцца толькі ў чаўнакоў. Мытнікі будуць самі вызначаць, хто перад імі — таемны парушальнік ці добрапрыстойны турыст.

Тое, што вывозілася з краіны, пры ўвозе абкладацца мытам не будзе.

**Ягор Марціновіч**




**аргументы «ЗА»:** стымуляванне развіцця ўнутранай эканомікі; заробак для дзяржавы з мытных пошлінаў

**аргументы «СУПРАЦЬ»:** абмежаванне свабоды выбару пакупніка; стварэнне няроўных умоваў для айчынных і замежных вытворцаў; магчымасць карупцыі для мытнікаў; бюракратызацыя — афармленне дадатковых дэкларацыяў

## СЦІСЛА

### «Ітэра» згарнула будоўлю да лепшых часоў

Узвядзенне першых хмарачосаў у Мінску, што мелася пабудаваць на скрыжаванні вуліцаў Кальварыйскай і Ціміразева, часова прыпынілася. Жыхары суседніх дамоў, якія пратэставалі супраць будаўніцтва дзвюх вежаў, могуць уздыхнуць з палёгкай.

У пачатку году пад будаўніцтва 54- і 43-павярховага будынкаў нават вырылі катлаван. Цяпер з будоўлі з'ехала ўся тэхніка, зніклі і рэкламныя плакаты.

Пры гэтым «Ітэра» настойвае, што з беларускага рынку сыходзіць не збіраецца, нягледзячы на фінансавы крызіс. Апроч згаданага бізнэс-цэнтру, расійская кампанія збіраецца будаваць «Мінск-Сіці», з тэмпамі будаўніцтва якога таксама спазняецца.

### Расія пабіла рэкорд экспарту збожжа

Расія сёлета пабіла гістарычны рэкорд экспарту пшаніцы, адправіўшы за мяжу з пачатку бягучага сельскагаспадарчага году больш за 17 мільёнаў тонаў.

Такія аб'ёмы збожжа Расія апошнія разы вывозіла ў дарэвалюцыйныя часы. Праз увесь савецкі час сельская гаспадарка СССР была дэфіцытнай, і пры канцы існавання Саюзу ён увозіў да чвэрці спажыванага збожжа з-за мяжы. Сёлета Расія чакае ўраджай каля 100 млн т.

### Белстат: 36,5% беларускіх прадпрыемстваў неплацежаздольныя

Больш за трацціну беларускіх прадпрыемстваў і арганізацыяў з'яўляюцца неплацежаздольнымі. Пра гэта паведаміў Нацыянальны статыстычны камітэт Беларусі (Белстат).

Прадпрыемствы лічацца неплацежаздольнымі тады, калі іх забяспечанасць абаротнымі сродкамі ніжэйшая за норму, а ліквіднасці, якую можна хутка рэалізаваць і здабыць тыя сродкі, — таксама не стае.

Больш за ўсё неплацежаздольных прадпрыемстваў у прамысловасці — 45,5% ад агульнай колькасці. Крыху лепшая сітуацыя ў гандлі і грамадскім харчаванні — 40,1%. У будаўніцтве лічба такіх прадпрыемстваў складае 35,6%.

На пачатку красавіка 44,9% айчынных прадпрыемстваў увогуле не мелі ўласных абаротных сродкаў і былі вымушаныя карыстацца з знешніх крыніцаў (крэдыты, датацыі). Болей усяго такіх прадпрыемстваў было ў у сельскай гаспадарцы (75,8%).

**ЯМ; МБ; ІЖ**

# БТнэпінг

**БТ разжылося новым блокбастэрам — меладрамай «Малады фронт. Kidnapping».**

«У сям'ю Святланы Лыскавец бяда прыйшла гэтай зімой — адзіны сын Яраслаў, у якім бацькі душы не чулі, рэзка змяніўся: стаў замкнутым, калючым, агрэсіўным... А аднойчы ў партфелі Яраслава маці знайшла ўлётку з заклікам прыйсці на мітынг...» — фільм эксплуатуе бацькоў, настрашаных палітычнай дзейнасцю сваіх дзяцей.

Галоўным пудзілам змаляваны Зміцер Дашкевіч — лідэр Маладога Фронту, які паўтара году праседзеў за свае погляды ў турме: «З часам Дашкевіч моцна змяніўся. Касуху памяняў на пінжак, на лацкан прычапіў бел-чырвона-белы значак, назваўся Змітром. І вось гопнік з правінцыі ператварыўся ў цэлага лідэра МФ».

«Іх лад жыцця ўяўляе вялікую пагрозу для моладзі, у якой толькі фармуецца светапогляд на жыццё», — заяўляюць аўтары фільму.

Матэрыялы фільму, як выглядае, сабраныя пераважна спецслужбамі. Наяўнасць іншых палітычных поглядаў (МФ, а не БРСМ), прыналежнасць да іншай культурнай традыцыі (беларускамоўнай, а не савецкай) фільм падносіць як сацыяльную і ці не псіхічную анамалію.

Альтэрнатыўны пункт гледжання на МФ БТ, вядома, не падае. Хоць меркаванні наконт гэтага Ніла Гілевіча, Вацлава Гаўла ды іншых знакамітых людзей вядомыя.

Аўтары фільму залезлі ў прыватнае жыццё моладзі, а таксама гвалтоўна ўварваліся ў хату бацькоў Змітра Дашкевіча, каб зняць іхні, нібыта недастойны побыт. Вось такая «журналісцкая» праца. Дарэчы, ананімная: фільм выйшаў без подпісу аўтараў. Праўда, блогеры адкапалі ў сацыяльных сетках фатаграфіі студэнта другога курсу журфаку, які фігураваў у фільме ў якасці інтэрв'юера. Выпадкова ці не, ён там нярэдка зняты з чаркай, а то і з цэлай пляшкай у руках.

**Зміцер Панкавец**

# Кніга аб мужнасці

**Працяг са старонкі 2.**

А што страцілі? Некаторыя — здароўе (ва Уладзіміра Плешчанкі ў турме яно было падарванае канчаткова), іншыя — веру ў правасуддзе. Мікола Астрэйка і Цімох Дранчук страцілі магчымасць убачыць першыя дні жыцця сваіх дзяцей.

Сярод герояў кнігі і Мікалай Аўтуховіч, які зноў апынуўся ў турме. Праўдзіцкімі выглядаюць ягоныя словы: «Думаю, што такіх выпрабаванняў з рознымі перашкодамі будзе яшчэ нямала, таму трэба назапашваць сілы, каб з гонарам іх вытрымаць».

І яшчэ больш страшна гучаць словы Аўтуховіча адносна галадовак. «Калі не ўпэўнены, што гатовы аддаць жыццё, калі давядзецца, то нават не варта пачынаць галадоўку».

Моцных турма зрабіла яшчэ мацнейшымі. Уражвае раздзел кнігі, прысвечаны Эніры Браніцкай. Гэтая прывабная дзяўчына за кратамі займалася гімнастыкай, маляваннем, шахматамі, жангляваннем, адціскannем, качаннем прэсу. Вось і не заставалася зусім вольнага часу нават у турме.

Адзначу, што чамусьці ўкладальнікі кнігі прапусцілі Змітра Каспяровіча, Мікіту Сасіма, Юрыя Радзівіла, Аляксандра Здзвіжкова... Зрэшты, напрыканцы кнігі напісана «Працяг будзе». Гучыць змрочна, але гэта наша рэальнасць. Няхай жа працяг не будзе доўгім.

**ЗП**

## ЦЫТАТЫ

### Дзеяч культуры Ялфімаў: «Я спяваў ах…цельна»

«Спяваў я ах...на! Так і напішыце. Дай Бог усім так спяваць», — сказаў прадстаўнік Рэспублікі Беларусь на конкурсе «Еўрабачанне» Пятро Ялфімаў заявіў адразу пасля першага паўфіналу конкурсу, адказваючы на пытанні беларускіх журналістаў.

Ялфімаў па выніках паўфіналаў заняў 27-месца сярод удзельнікаў.

### Генерал Грыб: «Партыя другі раз не прадаецца»

«Наша партыя, як гэта было ў выпадку з Казуліным, другі раз не прадаецца», — сказаў генерал Грыб, каментуючы «Беларускаму партызану» чуткі аб прыходзе ў партыю Пятра Краўчанкі.

# Пасля параду

Піша **Віталь Тарас**.

*Майму бацьку Валянціну Тарасу.*

Перад 9 Мая ў Расіі створаны законапраект «Аб супрацьдзеянні рэабілітацыі ў новых незалежных дзяржавах на тэрыторыі былога Саюзу ССР нацыстаў, нацысцкіх злачынцаў і іх памагатых». Цяпер, значыць, Масква хоча вызначаць, хто «апраўдвае нацызм» — і нават караць. Але сёння я буду гаварыць не пра тых, хто спекулюе ў палітычных мэтах на перамозе над гітлераўскай Германіяй. А пра тых, хто сапраўды змагаўся з фашызмам на франтах вайны, у падполлі, у партызанах.

### Парвалася сувязь часоў

Самым радасным святам для маіх бацькоў, безумоўна, быў дзень 9 Мая. Шмат гадоў у гэты дзень да нас на дачу прыязджалі старыя бацькавы сябры і знаёмыя, і сярод іх не толькі ўдзельнікі вайны. І заўсёды ва ўсіх быў прыўзняты настрой, які не меў, дарэчы, ніякага дачынення да таго, што гаманіла радыё, бо яго ніхто ў той дзень не слухаў і не глядзеў.

З цягам часу 9 Мая за нашым сталом збіралася ўсё менш гасцей.

...І было яшчэ 22 чэрвеня. У гэты дзень бацька шмат гадоў, пакуль дазваляла здароўе, уставаў а 4-й раніцы. Перад снеданнем выпіваў сто грамаў, закусваючы любімай стравай — чорным падсмажаным хлебам з алеем, прыпраўленым часнаком. Потым распавядаў — каторы раз — пра першыя дні вайны, пра бамбаванне Мінску, пра тое, як хлапчукі і ён сам невядома з якой дурасці радаваліся пачатку вайны, і як ужо 29 чэрвеня прыйшлі гітлераўцы. Бацька вельмі злаваўся, калі чуў афіцыйную ману пра «лінію Сталіна», пра тое, што дзякуючы ёй удалося, нібыта, надоўга затрымаць наступ немцаў.

Усё гэта і шмат чаго іншага, звязанага з вайной, ён апісаў у сваіх кнігах. І мне не прыходзіла да галавы — распытаць бацьку яшчэ больш дэталёва. Цяпер разумею, што так нічога да канца і не ведаю. І спытацца больш няма ў каго.

Так здарылася, што 22 чэрвеня 2003 стала для бацькі яшчэ больш горкай датай. У гэты дзень памёр Васіль Быкаў, з якім ён сябраваў амаль усё сваё жыццё. 19 чэрвеня яму споўнілася 79 гадоў, а праз тры дні пісьменніка не стала. Мой бацька памёр сёлета 13 лютага, праз чатыры дні пасля свайго дня нараджэння. Яму таксама споўнілася 79... Не хачу шукаць тут нейкія нумаралагічныя супадзенні. Для мяне відавочна іншае. Бацька і Быкаў, таксама як і Алесь Адамовіч, і крытык Рыгор Бярозкін, і паэты Навум Кісьлік і Аляксандр Дракахруст былі не проста сябрамі, якія прайшлі некалі вайну, кожны паасобку. Пасля вайны яны былі звязаныя паміж сабой не толькі сяброўствам або таварыствам, але нейкай унутранай маральнай повяззю.

Дракахруст, найстарэйшы з іх, памёр у лістападзе мінулага году. Бацька быў наймалодшы — ён пайшоў у партызаны ў 1944-м, калі яму толькі споўнілася 14.

І сёння я амаль фізічна ўяўляю, што гэта значыць, калі рвецца сувязь часоў.



МАСІМІЛЬЯНА КЛЯЎЗІ

### «Мы не сядзелі ўвесь час і не аб'ядаліся»

Так здарылася, што ў дзень смерці бацькі я быў на кніжнай выставе. Там Павел Мажэйка перадаў мне некалькі асобнікаў кнігі «Зрабаваны народ», у якую ўвайшлі гутаркі з дзеячамі беларускай культуры. Думаў парадаваць бацьку — там было і яго інтэрв'ю пад назвай «Я бараніў савецкую Беларусь». Не паспеў, спазніўся ўсяго на некалькі гадзінаў...

На пытанне — як вы ставіцеся да меркаванняў, што немцы былі проста чарговымі акупантамі пасля Саветаў і беларусы, калі б сядзелі ціха, лягчэй перажылі б вайну? — бацька адказаў: «Гэта глупства. Пасля таго як гітлераўскія немцы напалі на Савецкі Саюз, вайна на тэрыторыі СССР набыла абарончы характар. Так, гітлераўскі рэжым не многім розніўся ад сталінскага, але калі гэтыя дзве жахлівыя ідэалогіі сутыкнуліся паміж сабой на тэрыторыі, на якой жылі беларусы, то які ў нас быў выбар?»

Пра нямецкіх акупантаў: «Ад самага пачатку знаходжання на гэтай зямлі яны паказалі, якія маюць намеры і хто яны. Не было яшчэ ніякіх партызанскіх рухаў, а вёскі ўжо гарэлі. Быў уведзены нязвыкла жорсткі акупацыйны рэжым. Амаль за ўсё пагражалі расстрэлам. Я ведаў, што не толькі камуністы ваявалі з немцамі. Мы былі ў антыгітлераўскай кааліцыі, да якой належалі і вялікія заходнія дэмакратыі».

Пра партызанаў і вёску: «З вёсак забіралі апошнюю быдла і свіней (...) Людзі не маглі не дапамагаць нам. У многіх партызанаў былі ў вёсках сем'і. Было і так, што хлопец выходзіў з лесу і ішоў забіраць апошнюю свінню ў роднага бацькі. Мы хаваліся ў лесе, мелі зброю і па магчымасці дзейнічалі. Мы ж не сядзелі ўвесь час і не аб'ядаліся. Рабілі засады на немцаў, я браў удзел у трох сутычках і быў паранены. Але ўсё гэта было магчыма дзякуючы вёсцы. Вайну выйграла беларуская вёска».

### Вечная слава

Калі тыя хлопчыкі і дзяўчынкі, яўрэі і беларусы, татары і ўкраінцы, расійцы і палякі, змагаліся з фашызмам — хто «за ідэю», хто проста ад таго, што так склаўся лёс, дык усім ім належаць гонар і слава. Тое, што іх подзвігам скарыстаецца Сталін, што пакутамі і мужнасцю тых юнакоў і дзяўчат дагэтуль спекулююць іхнія нашчадкі, ёсць трагедыяй. Але гэта ніякім чынам не перакрэслівае таго, што зрабілі тыя хлопцы. Усе яны сталі ў выніку, хай усяго на адзін дзень, пераможцамі над фашызмам. Яны выстаялі разам з усім цывілізаваным светам.

Сярод іх быў мой бацька.

Партызанскага параду, у якім яму пашчасціла ўдзельнічаць 16 ліпеня 44-га ў Мінску, не будзе ўжо больш ніколі. Засталася толькі памяць.

# У паўкроку да культуры спажывання

Ініцыятыву ўладаў увесці адміністрацыйную адказнасць за ўжыванне піва і алкагольных напояў у грамадскіх месцах можна толькі вітаць. Але адкрытым застаецца пытанне, ці гатовая нашая інфраструктура адпачынку прыняць у сябе ўсіх тых, хто аддае перавагу адпачынку з півам на вуліцы.

## Доўгачаканы канец піўных сезонаў

У хуткім часе, калі ўлады давядуць да лагічнага канца сваю ініцыятыву, смак выпітага ў грамадскім месцы піва ўзбагаціцца горыччу адміністрацыйнай адказнасці. Парламент мае разглядзець унесены кіраўніком краіны папраўкі, згодна з якімі ў Беларусі плануецца ўвесці адміністрацыйную адказнасць і за распіццё піва ў грамадскіх месцах. Сённяшняя рэдакцыя Кодэксу аб адміністрацыйных правапарушэннях прадугледжвае адказнасць за ўжыванне толькі алкагольных напояў на вуліцах, стадыёнах, у скверах, парках, грамадскім транспарце ці другіх грамадскіх месцах, апроч спецыяльна вызначаных для ўжывання алкагольных напояў.

Калі раней ужыванне піва на вуліцы не каралася рублём, то ў выпадку, калі папраўкі прыжывуцца ў законе, задавальненне стане досыць дарагім — прапанаваны памер штрафу сягае да 280 тысяч рублёў (каля $100).

Ініцыятыву ўладаў можна вітаць. Каб зразумець, як шмат у нас п'юць проста на вуліцах, варта хоць аднойчы выбрацца на Захад. І не абавязкова далёка — досыць будзе Літвы ці Польшчы. Вярнуўшыся адтуль, цяжка будзе пазбавіцца ўражання, што ў Беларусі адбываецца перманентнае агульнанацыянальнае свята: ужо на галоўным чыгуначным вакзале краіны на вочы пачнуць трапляцца маладыя і не вельмі людзі з пляшкамі піва, а то і чаго мацнейшага. Тое самае, а мо і ў большай ступені, можна назіраць у спальных раёнах.

«Мне сорамна, а часам і страшна выходзіць з маленькімі дзеткамі на вуліцу, бо там я выглядаю, як з іншай планеты, — не п'ю піва, не лаюся матам, не кідаю пакетаў пад ногі», — наракае маладая мама.

Даўно не дзіва чалавек з півам у грамадскім транспарце, нават у метро. Нічога дзіўнага: у Мінску катастрафічна бракуе кавярняў і бараў. Дый у тых барах піва «каштуе, як у Чэхіі, а на смак, як ... у нас», — скардзіцца студэнт.

## «У Польшчы мы таксама да гэтага не адразу прывыклі»

Першы крок амаль зроблены, застаецца дачакацца моманту, калі новаўвядзенне запрацуе напоўніцу. Рабіць прагнозы, што з гэтага выйдзе, — справа няўдзячная, але можна звярнуцца да прыкладу нашых суседзяў.

У Літве і Польшчы забарона на ўжыванне алкаголю ў грамадскіх месцах, у тым ліку піва, замацаваная на заканадаўчым узроўні. Тую забарону далёка не кожны паляк успрыняў з захапленнем. Аўтару гэтых радкоў давялося патрапіць у Кракаў у 2005 годзе. Тады яшчэ можна было пабачыць на беразе Віслы купкі маладзёнаў, якія, азіраючыся, папівалі піва ды скардзіліся на паліцыянтаў, што прымушалі іх ісці ў кавярню. Гучалі і знаёмыя нашаму вуху скаргі на тое, што ў бары піва куды даражэйшае, чым у краме. Але новаўвядзенне справакавала бум у сферы абслугоўвання — кавярні і бары раслі, як грыбы пасля дажджу. Цяпер, наведваючы Польшчу, усё менш даводзіцца чуць нараканні аматараў піва на «бесчалавечную ўладу». Паходы ў кавярню, замест адрэналінавага сядзення з пляшкай у парку, зрабіліся нормай. Самым незгаворлівым культуру спажывання прышчапілі з дапамогай істотных штрафаў.



PHOTO.BYMEDIA.NET

У Латвіі і Эстоніі, у Расіі піва можна ўжываць толькі ў спецыяльна абсталяваных побач з кропкамі рэалізацыі месцах, а таксама з пляшак, схаваных у тканіну ці паперу.

Вярхоўная Рада Украіны сёлета прыняла ў першым чытанні законапраект, які мае забараніць продаж піва і слабаалкагольных напояў непаўналетнім, а таксама прыраўняе іх да алкагольных напояў, што аўтаматычна пацягне за сабой забарону ўжывання іх у грамадскіх месцах.

Цікавым падаецца вопыт не такой ужо і далёкай ад нас Швецыі, дзе антыалкагольная кампанія мае агульнанацыянальны характар і традыцыі, якія вымяраюцца не адным стагоддзем. Моцнае спіртное тут прадаецца толькі ў спецыялізаваных крамах, колькасць якіх абмежаваная, як і працягласць працоўнага дня гэтых установаў. У астатніх крамах прадаецца піва, утрыманне спірту ў якім не перавышае 3,5 градусы, нават портэр.

## Што дапаможа нам

Запачаткаваўшы сумнеўную традыцыю масавых гульбішчаў з абавязковым алкаголем на разліў на вольным паветры, якая затым перарасла ў звычку штодзённую, улада проста абавязаная выпраўляць сітуацыю не толькі адно адміністрацыйнымі мерамі.

Вопыт нашых суседзяў сведчыць, што кампаніям па выцясненні піва з вуліцаў папярэднічала бурлівае развіццё сферы адпачынку, а дзе-ндзе, як у той жа Польшчы, вымушаны сыход з вуліцаў вялікай часткі спажыўцоў справакаваў дадатковы штуршок у гэтым сектары. Сітуацыя ў Беларусі істотна адрозніваецца нават ад суседняй Украіны, дзе даўно ўжо не стаіць праблема з пошукам месца адпачынку.

Адзін з уладальнікаў мінскага паб-клубу «Графіці» Мікалай Маторын аптымістычны: «Цяпер можна казаць пра хвалю ў гэтай сферы — у хуткім часе ў сталіцы з'явіцца вялікая колькасць кавярняў». Ён упэўнены, што адчыніць сваю кавярню ці бар — цалкам вырашальная задача: «Галоўнае, каб было жаданне. Мы ж адчыніліся».

**Сямён Печанко**

# За ўсё плачу!

«НН» падлічыла, колькі каштуе для сярэднестатыстычнага мінчаніна–падаткаплатніка рэалізацыя праектаў і ідэяў Мінгарвыканкаму.

Паводле апошніх звестак Мінгарвыканкаму, бюджэт беларускай сталіцы на 2009 год склаў 6 486 322 300 500 беларускіх рублёў (каля 2,32 мільярдаў даляраў). Вядома ж, гэтыя агромністыя лічбы не збіраюцца цалкам з жыхароў сталіцы. Прыбытковая частка на 92% складаецца з падаткаў, з агульнай сумы якіх 35% прыходзяцца на падаткі фізічных асобаў. Такім чынам, 32% ад бюджэту сталіцы — гэта менавіта тыя грошы, якія «ўкідваюць» у агульную скарбонку мінчане. Трэба ўлічыць, што заробак сярэднестатыстычнага мінскага работніка да выліку падаткаў роўны 1 мільён 180 тысяч, а стаўка падаходнага падатку з фізічных асобаў — 12%.

Тады становіцца лёгка вылічыць фінансавы ўнёсак кожнага мінчаніна ў рэалізацыю хаця б некаторых праектаў і ідэяў Мінскага выканкаму.

## Праца мясцовага кіравання

Заробак саміх чыноўнікаў, выдаткі на іх працу (ад машынаў да канцылярскіх тавараў), паслугі прыбіральшчыцаў, сакратарак, кіроўцаў — усё, што дазваляе існаванне аднаго акна, у якое кожны з нас час ад часу стукаецца, — каштуе сёлета 74,4 мільярда рублёў (26,5 мільёнаў даляраў). Гэта 1614 рублёў з кожнага падаткаплацельшчыка.

## Дзяржаўныя датацыі гарадскім сродкам масавай інфармацыі

На ўтрыманне гарадскіх СМІ з гарадскога бюджэту выдзелена 13,5 мільярдаў рублёў (4,8 мільёна даляраў). 293 рублі кожны мінчанін аддае на дапамогу газетам «Минский курьер», «Вечерний Минск», газетам кожнага мінскага раёну, кшталту «Фрунзенский вестник», радыё «Сталіца», «Мінск» і інш. Але хто з мінчан хоць раз бачыў сваю раённую газету?

## Абслугоўванне запазычанасцяў органаў мясцовага кіравання і самакіравання

Запазычваць — дык з размахам! Вяртанне пазыкаў за гэты год складае 17 мільярдаў рублёў (каля 6 мільёнаў даляраў), 370 рублёў з гаманца кожнага сталічнага жыхара.

## Развіццё наземнага транспарту

Нягледзячы на тое, што амаль увесь парк аўтобусаў і тралейбусаў заменены на новы, у Мінсктранса з'яўляюцца ўсё новыя ідэі па ўдасканаленні працы грамадскага транспарту. Гэта і закупка новых мадэляў аўтобусаў і тралейбусаў — старыя машыны пры гэтым аддаюцца бясплатна ў невялікія гарады, часам нават за межы Беларусі. Гэта абсталяванне кожнага аўтобуса спецыяльным датчыкам, які дазволіць адсачыць, дзе знаходзіцца зараз машына. Гэта і ўвядзенне сістэмы электронных кампосцераў у наземным транпарце, павелічэнне штату кандуктараў. Выдаткі бюджэту, звязаныя з транспартам, складаюць 518 мільярдаў рублёў (185 мільёнаў даляраў). Такім чынам, кожны падаткаплатнік сталіцы, нават той, які ездзіць на ўласнай машыне, аддае 11 275 рублёў.

## Будаўніцтва раваровай дарожкі

Да ідэі раварызацыі сталіцы ўлады падышлі з вялікім замахам, праўда, рэалізацыя праекту прасоўваецца млява. Дарожку праз увесь Мінск, ад Вяснянкі да Чыжоўкі, хочуць дабудаваць у гэтым годзе. З 27 кіламетраў трасы пакуль адкрыты толькі невялікі ўчастак. Працяг будоўлі адкладваецца з-за недахопу грошай. Яшчэ б! Праект ацэньваецца прыблізна ў 10 мільёнаў даляраў (праўда, за некалькі гадоў) — 610 рублёў на брата.

## Спартыўныя клубы

У сістэму Мінгарвыканкаму ўключаныя футбольны клуб «Мінск», хакейны клуб «Юнацтва-Мінск», баскетбольны клуб «Мінск-2006» і валейбольны «Мінск». Не ўсе з іх могуць пахваліцца выбітнымі дасягненнямі, але ўлады не застаюцца ўбаку. Апроч іншага, бюджэтам выдзеленае фінансаванне капітальнага і бягучага рамонту збудаванняў ФК «Мінск» на суму 764 мільёны рублёў (270 тысяч даляраў) — 17 рублёў з кожнага мінчука.

**Ягор Марціновіч**

# Проста кантракт такі

**Даследаванне Беларускага інстытуту стратэгічных даследаванняў і сацыялагічнай лабараторыі «Новак» ламае стэрэатып пра беларусаў як пра нейкую асаблівую нацыю «лагодных» і «памяркоўных».**

Падсавецкі кіраўнік Венгрыі Янаш Кадар збудаваў у сацыялістычнай Венгрыі «гуляшны сацыялізм». Улады гарантавалі кожнаму венгру чарку і скварку, г.зн. такай і гуляш. Адзінай умовай нармальнага існавання было прыманне сацыялістычных правілаў гульні: сядзі ціха, не пратэстуй, а прыстасоўвайся.

Ці існуе ў Беларусі падобная няпісаная дамова між уладай і грамадствам? І ў абмен на што беларусы «прадаюць» сваю лаяльнасць? Эксперты Беларускага інстытуту стратэгічных даследаванняў сумесна з сацыялагічнай лабараторыяй «Новак» падрыхтавалі даследаванне «Прырода сацыяльнага кантракту ў сучаснай Беларусі: крыніцы палітычнай стабільнасці, прастора для пераменаў».

Калі параўноўваць пачатковы перыяд кіравання лукашэнкаўцаў з сённяшнім днём, заўважна, як змянілася група падтрымкі ўлады і матывацыя гэтай падтрымкі. На змену эмацыйнаму захапленню харызматычным кіраўніком, які абяцае перамагчы карупцыю і навесці парадак, прыйшло падпарадкаванне ў абмен на пэўныя выгоды, якія прадастаўляе ўлада. Такая з’ява мае назву сацыяльнага кантракту. На падтрыманні бакамі ўмоваў і грунтуецца беларуская «стабільнасць».

Сацыяльны кантракт сітуатыўны. Ён моцна залежыць ад эканамічнай і палітычнай сітуацыі, бо ёю вымяраецца як узровень дабротаў, якія ў стане прапанаваць улада, так і ўзровень свабодаў, якія яна можа дапусціць. Напрыклад, у пачатку 2009 г. улада змяніла ўмовы кантракту: прапанавала грамадству захоўваць лаяльнасць пры атрыманні на 20% меншага заробку.




Умовы сацыяльнага кантракту свае для кожнай групы насельніцтва. Эксперты вызначылі пяць асноўных такіх групаў, аналізуючы інтэрпрэтацыі ў галоўнай дзяржаўнай газеце «Советская Белоруссия» новых нарматыўна-прававых актаў. У большасці выпадкаў пасланне скіроўваецца да чыноўнікаў, бізнэсоўцаў, найманых работнікаў, моладзі і насельнікаў сельскіх тэрыторыяў (малых гарадоў, аграгарадкоў, сельскай мясцовасці).

### Чаго хоча моладзь

А чаго сённяшняя беларуская моладзь хоча? Эксперты высвятлялі гэта, задаючы пытанне «Што ў вас будзе праз 10 гадоў?» Па выніках адказаў акрэсліліся пяць асноўных падыходаў да жыцця.

Прыхільнікаў першага можна назваць «самарэалізатарамі». Іх жыццёвыя прыярытэты — дасягненне прафесіяналізму ў сваёй сферы, кіраўнічая пасада, рэалізацыя творчых і чалавечых магчымасцяў.

Наступная група — «паспяховыя». Для іх важныя вонкавыя атрыбуты таго, што «жыццё ўдалося»: кар’ера, катэдж за горадам, высокі заробак.

Для «палітыкаў» галоўнае — заваёва вядомасці і аўтарытэту, у тым ліку ў грамадскай дзейнасці.

Чацвёртая група, «прадпрымальнікі», жадаюць мець уласны бізнэс. І абавязкова — у вялікім горадзе або за мяжой. Ні ў якім разе не ў сельскай мясцовасці на радзіме.

І апошняя група — «мінімалісты». Іх вабіць праца па спецыяльнасці і шчаслівае сямейнае жыццё.

Першыя дзве групы найбольшыя колькасна. «Палітыкаў» — найменш, усяго каля 10% ад апытаных.

Па сярэдніх значэннях стаўлення да прапанаваных пяці сцэнароў жыцця ўся маса моладзі падзяляецца яшчэ на «актывістаў» (53%) і «летуценнікаў» (47%). Актывісты разлічваюць на ўласныя сілы ў забеспячэнні свайго будучага дабрабыту, летуценнікі схільныя шукаць дзяржаўнай падтрымкі. Сярод апошніх 46% апытаных (каля 22% ад усёй апытанай моладзі) згодныя, што прымусовае размеркаванне лепш, чым няпэўнасць у пытанні працаўладкавання. Істотны момант: актывісты імкнуцца не ангажавацца ў «палітыку», бо гэта можа перашкодзіць у дасягненні жыццёвых мэтаў.

### Бізнэс: пратэст нерацыянальны

Да тае самае думкі схіляецца сёння і бізнэс. Сацыяльны кантракт улады з бізнэс-коламі можна назваць «вертыкальным». Улада ўверсе, бізнэс — унізе. Бізнэсоўцы скардзяцца на абмежаваныя магчымасці для дыялогу з уладай, зменлівыя правілы гульні, калі лукашэнкаўцы могуць забіраць і пераразмяркоўваць правы, ствараючы больш спрыяльныя ўмовы для набліжаных бізнэсоўцаў.

Але ў наяўнай сітуацыі бізнэс-колы бачаць і шэраг плюсаў. Напрыклад, пэўная закрытасць эканомікі, якая забяспечвае ніжэйшую канкурэнцыю, «адкаты» меншыя, чым у суседзяў, і ўвогуле ніжэйшая карупцыя.

Бізнэсоўцы рэдка ўжываюць пратэстныя меры. Яны найбольш сярод усіх апытаных групаў насельніцтва схільныя вырашаць пытанні з уладай шляхам лабіравання інтарэсаў праз асабістыя кантакты або зварот у суд. «Дзяржава робіць усё, каб прадпрымальнікі не ўдзельнічалі ў палітыцы, — канстатавалі апытаныя. — Прыбыткі ад бізнэсу перавышаюць магчымыя выдаткі ад барацьбы з дзяржавай». Сярод прадстаўнікоў бізнэс-колаў — найбольшы працэнт ахвотных з’ехаць з краіны (каля 30%).







### Пенсіянеры скрадзяцца, але церпяць

Калі прааналізаваць агульную колькасць людзей, згодных на сацыяльны кантракт, выявіцца, што палову з іх складаюць беспрацоўныя пенсіянеры.

Пенсіянеры характарызуюцца ніжэйшым узроўнем чаканняў ад дзяржавы. Як вынікае з даследавання, гэтай патэрналісцка арыентаванай групе даспадобы тое, што ўлада забяспечвае палітычную стабільнасць, абарону ад крыміналу, бясплатную медыцыну, законнасць.

Яны нашмат менш задаволеныя якасцю медабслугоўвання, памерамі пенсіяў, наяўнымі льготамі, чым астатнія катэгорыі насельніцтва, але трываюць і згодныя на працяг кантракту.

Пенсіянеры лічаць, што дзяржава клапоціцца пра іх. Тады як усе астатнія так не думаюць. Паводле апытання на тэму, якія сацыяльныя групы найлепш падтрыманыя дзяржавай, на першыя месцы трапілі чыноўнікі (гэтак лічаць 55,8% апытаных), міліцыя, спецслужбы і АМОН (50,8%), вайскоўцы (35,7%), спартоўцы (17,2%).

У цэлым задаволенасць пенсіянераў сацыяльным кантрактам вышэйшая, чым у іншых групаў насельніцтва. Пенсіянеры рэдка пратэстуюць у выпадку незадавальнення. Пашыраная сярод іх форма змагання — скаргі ў дзяржаўныя органы.

**Наступная табліца паказвае, як звязаныя прыбытак і схільнасць да сацыяльнага кантракту:**
(СК — група сацыяльнага кантракту, НВ — тыя, хто не вызначыўся, АД — тыя, хто адмаўляе, БП — беспрацоўныя пенсіянеры).

| | *СК* | *НВ* | *АД* | *БП* |
|---|---|---|---|---|
| Можам дазволіць вялікія закупы | 30,8 | 25,0 | 19,2 | 25,0 |
| Можам рабіць адкладанні | 24,4 | 31,1 | 21,2 | 23,4 |
| Ледзь сточваем канцы з канцамі | 23,3 | 26,0 | 18,5 | 32,2 |
| Адмаўляем сабе ў самым неабходным | 22,5 | 33,3 | 20,8 | 23,3 |
| Сямейны прыбытак (тыс.руб.) | *СК* | *НВ* | *АД* | *БП* |
| да 400 | 13,9 | 11,5 | 6,67 | 67,8 |
| 401-1250 | 21,1 | 23,8 | 13,9 | 41,2 |
| 801-1250 | 25,5 | 30,6 | 21,4 | 22,5 |
| 1251-1750 | 34,5 | 36,5 | 22,3 | 6,5 |
| 1751-2500 | 26,1 | 39,6 | 32,4 | 1,8 |
| Больш за 2500 | 30,4 | 34,8 | 30,4 | 4,3 |
| Няма адказу | 21,6 | 39,7 | 28,9 | 9,8 |

Досыць вялікая колькасць людзей не прымае сацыяльнага кантракту. Але нават яго разрыў не абазначае сыход у актыўную пратэстную групу. **У наступнай табліцы паказана стаўленне апытаных да ўдзельнікаў акцыяў пратэсту.**

| | СК | НВ | АД | БП | Разам |
|---|---|---|---|---|---|
| Я думаю, гэтым людзям плацяць | 27,5 | 16,7 | 11,1 | 35,4 | 23,2 |
| Гэтыя людзі дзейнічаюць нерацыянальна — вулічнымі акцыямі нічога не даб’ешся | 33,9 | 21,5 | 20,7 | 26,8 | 25,7 |
| Гэта смелыя людзі, вартыя павагі | 25,9 | 37,6 | 50,0 | 11,6 | 30,3 |
| Іншае | 0,5 | 1,9 | 1,0 | 2,1 | 1,5 |
| Цяжка сказаць | 12,3 | 22,3 | 17,2 | 24,0 | 19,4 |

Як бачым, 23% апытаных лічаць, што ўдзельнікам акцыяў пратэсту плацяць грошы. Пашыранасць такога меркавання тлумачыцца тым, што людзі, якія ўдзельнічаюць у дзяржаўных мерапрыемствах — афіцыйных дэманстрацыях, арганізаваных паходах на хакей, — атрымліваюць бонусы ў выглядзе адгулаў, прэміяў і г.д., кажуць эксперты.

Што ж застаецца ў выпадку непрымання сацыяльнага кантракту і нежадання ўдзельнічаць у акцыях пратэсту? Сацыёлагі называюць гэты трэці шлях выхадам. Выхад можа набываць розныя формы: эміграцыя, пераход з дзяржаўнай працы ў прыватную фірму, нават алкагольнае забыццё. Цікава, што група незадаволеных з’яўляецца найбольш сацыяльна пасіўнай. Яна арыентаваная на выхад у любой форме, а не на пратэст. Большасць тых, хто па-за гульнёй дзяржавы, мысляць сябе і па-за краінай. Замена пратэсту на выхад выгадная ўладзе, бо зніжае градус грамадскага напружання. «Спецыфіка сацыяльнага кантракту ў Беларусі — увесь негатыў, які можа перайсці ў голас, пераходзіць у выхад», — кажа дырэктар BISS Віталь Сіліцкі.

Ён адзначае таксама, што парог выхаду з сацыяльнага кантракту ў Беларусі досыць высокі. Дазволіць гэта могуць нямногія: тыя, хто ад пачатку не ідзе на дзяржаўную працу і ў стане забяспечыць сабе нармальны прыбытак па-за дзяржаўнай сферай. **У наступнай табліцы бачна: чым старэйшае пакаленне, тым больш яно завязанае на сацыяльны кантракт.**

| | *СК* | *НВ* | *АД* | *БП* | СК+БП |
|---|---|---|---|---|---|
| Узрост | | | | | |
| 18-24 | 21,8 | 42,3 | 35,9 | 0,0 | 21,8 |
| 25-34 | 25,4 | 44,3 | 30,3 | 0,0 | 25,4 |
| 35-44 | 32,4 | 39,1 | 26,8 | 1,8 | 34,2 |
| 45-54 | 41,4 | 34,2 | 19,7 | 4,6 | 46,1 |
| 55-64 | 18,4 | 13,0 | 4,3 | 64,3 | 82,7 |
| 65+ | 0,0 | 0,0 | 0,0 | 100,0 | 100,0 |
| | *СК* | *НО* | *ОТ* | *НП* | СК+НП |
| Працуе на | | | | | |
| Прыватным прадпрыемстве | 16,2 | 42,1 | 41,7 | 0,0 | 16,2 |
| Дзяржаўным прадпрыемстве | 40,4 | 39,9 | 19,7 | 0,0 | 40,4 |
| Не ведае | 25,0 | 53,6 | 21,4 | 0,0 | 25,0 |
| Не працуе | 9,2 | 13,0 | 12,6 | 65,2 | 74,4 |

«Наша даследаванне ламае стэрэатып пра беларусаў як пра нейкую асаблівую нацыю «лагодных» і «памяркоўных» людзей. Любы народ дакладна гэтак сама прыстасоўваўся б да такіх умоваў», — кажа Віталь Сіліцкі.

Цікава, што, падпарадкоўваючыся патрабаванням улады, беларусы моцна не разлічваюць на яе помач у пытаннях іх асабістага дабрабыту, адукацыі, занятасці. Людзі лічаць, што ў гэтых пытаннях мусяць разлічваць выключна на сябе. Што дае падставы назваць беларусаў пад уладай Лукашэнкі «нацыяй пабытавых індывідуалістаў».

**Сяргей Мікулевіч**

# Уладзімір Макей зноў стане бацькам

Паводле інфармацыі «Беларускага партызана», кіраўнік Адміністрацыі прэзідэнта Уладзімір Макей бліжэйшым часам стане бацькам. Яго жонка, папулярная вядучая Вера Палякова, павінна вось-вось нарадзіць.

І для Паляковай, і для Макея гэта ўжо не першы шлюб. У Веры Паляковай ёсць дзесяцігадовы сын Дзмітрый. А ў Макея ад першага шлюбу ёсць таксама сын Віталь. Ён працуе першым сакратаром пасольства Беларусі ў Аўстрыі.

Вера Палякова нарадзілася ў 1978 г., то бок яна на 20 гадоў маладзейшая за Макея. Скончыла Беларускую дзяржаўную акадэмію мастацтваў. Грала ў многіх тэатрах, у тым ліку імя Янкі Купалы. Шлюбам з Уладзімірам Макеем пабралася ў 2007 г. Вядзе ток-шоу на Першым канале «Жыццё як жыццё». У 2007 г. выпусціла альбом песень «Актрыса».

**ЗП**

# Басовішча: Фэст застанецца, а ў конкурсе няма сэнсу

**Арганізатары «Басовішча» распавялі пра падрыхтоўку да дваццатага па ліку фэсту, што адбудзецца 17—18 ліпеня ў польскім Гарадку.**

Фестываль «Басовішча» пройдзе 17 і 18 ліпеня на традыцыйнай пляцоўцы — ва ўрочышчы Барок, што ля польскага Гарадку (35 км ад Беластоку). Ладзяць фестываль новыя людзі — нядаўна ў Беларускім аб'яднанні студэнтаў змянілася кіраўніцтва. Старшынёй абраная Мажэна Саевіч, яе намесніцай — Кася Кузьміч. «Гэты фестываль юбілейны, таму мы вырашылі ўнесці змены ў яго фармат і канцэпцыю», — кажа Мажэна.

Паводле задумы, Барок мае пераўтварыцца ў «машыну часу».

«Мы хочам паказаць людзям 20-гадовую гісторыю фэсту, бо часта даводзіцца чуць пытанні кшталту «А чаму «Басовішча» раней адбывалася ў Беларусі, а цяпер у Польшчы»? Плануем у адмысловых намётах паказваць відэа ад першых фэстаў, а на сцэне будуць выступаць хэдлайнеры першых «басоў» — гурты «Бонда» і «Мроя», — апавядае Кася.

Часткова адрадзіцца і пераўвасобіцца ў легендаў беларускага року з задавальненьнем пагадзіліся як Лявон Вольскі, так і Ігар Варашкевіч. Адпаведна N.R.M. і «Крама» цяпер узмоцнена рэпетуюць ды згадваюць песні гуртоў-папярэднікаў. Не выключана, што музыкі нават апрануцца ў стылі пачатку 1990-х.

А вось ад вольнай сцэны і конкурсу сёлета вырашылі адмовіцца.

«Гурты, якія перамагалі ў конкурсе апошнім часам, па-сапраўднаму так і не даказалі сваю вартасць. Таму без сэнсу рабіць конкурс і раздаваць узнагароды, калі маем такі ўзровень. Маем надзею, што ў наступным ён адбудзецца на вышэйшым узроўні», — тлумачыць Кася Кузьміч.

Цяпер кіраўніцтва БАС вядзе перамовы з польскімі чыноўнікамі наконт выдачы беларускім гледачам бясплатных візаў для паездкі ў Польшчу.

Спіс выступоўцаў «Басовішча-2009» фактычна сфармаваны. Апроч «Бонды» і «Мроі», выступіць Neuro Dubel, вядуцца перамовы з гуртом Ulis. З маладзейшых зайграюць Rahis, Jab Club, «Дзецідзяцей». З лаўрэатаў фэсту ранейшых гадоў на сцэну выйдуць Znich, RIMA, «Бан-Жвірба», :B:N:, IQ48, Tarpach.

Фестываль пачнецца 17 ліпеня, у пятніцу, у 17:00, а скончыцца позна ўначы 18 ліпеня. Уваход на пляцоўку — вольны.

**Тузін Гітоў**




# Глеб — чэмпіён Іспаніі і ўладальнік каралеўскага Кубку

Удалым атрымаўся мінулы тыдзень для паўабаронцы зборнай Беларусі па футболе Аляксандра Глеба. У складзе «Барселоны» ён стаў чэмпіёнам Іспаніі, а таксама выйграў каралеўскі Кубак.

Сам Глеб у 35 матчах у чэмпіянаце Іспаніі згуляў толькі ў 16. Прычым у пяці выйшаў у стартавым складзе, у 11 выйшаў на замену. Не забіў ніводнага мяча і аддаў тры галявыя перадачы.

А некалькі тыдняў таму пераход беларуса з «Арсеналу» ў «Барселону» прызналі самым няўдалым трансферам сезону ў іспанскім чэмпіянаце. Аляксандр Глеб перайшоў у «Барселону» летам 2008 году за 15 мільёнаў еўра. Падлічана, што кожная хвіліна, згуляная беларусам у чэмпіянаце Іспаніі, абышлася «Барселоне» ў 33 040 еўра.

Наўрад Аляксандр застанецца ў «Барселоне» налета. Цяпер хаўбекам цікавяцца шэраг нямецкіх клубаў — «Баварыя», «Штутгарт», «Шальке-04».

**ЗП**

## СЦІСЛА

### Піць трэба менш

Доля рэалізацыі алкагольнай прадукцыі ў агульным аб'ёме рознічнага тавараабароту Беларусі склала 12%. Паводле Белстату, на спажывецкім рынку было рэалізавана алкагольнай прадукцыі і піва на 1 трлн. 439,4 млрд. рублёў. Нягледзячы на крызіс, а мо дзякуючы яму, продаж гарэлкі вырас на 4,1% у параўнанні з аналагічным перыядам 2008 г. (да 3 млн. 550,3 тыс. дал). Яе доля ў агульным аб'ёме спажывання алкаголю склала 49,4% (у мінулым годзе — 47,1%).

### Мэтавікі будуць адпрацоўваць тры гады

Павялічаныя тэрміны адпрацоўкі для тых, хто навучаўся на ўмовах мэтавай падрыхтоўкі. Так, пасля ВНУ давядзецца адпрацаваць не менш як тры гады, пасля ССНУ — не менш як адзін год. Указ аб гэтым нумар 243 Аляксандр Лукашэнка падпісаў 12 мая.

### Кожны дзесяты — на вуліцу

У сувязі з рэформай сістэмы адукацыі ў беларускіх школах скарочана 789 ставак настаўнікаў фізкультуры. Колькасць урокаў фізкультуры скарацілася з трох да двух разоў на тыдзень, колькасць ставак — з 8,3 тыс. да 7,5 тыс. У наступным годзе нагрузка скароціцца яшчэ больш.

### Крыж-помнік Каліноўскаму на Лукішках будзе захаваны

Таварыства беларускай культуры атрымала адказ з Міністэрства культуры Літвы, што крыж, усталяваны на месцы пакарання смерцю Кастуся Каліноўскага, будзе захаваны. Літоўскі ўрад адрэагаваў на заявы Таварыства і накіраваў адпаведнае рашэнне ў Міністэрства культуры.

### Кватэры будуць таннець і летам

Летась стандартная двухпакаёўка ў сталічным раёне Шабаны каштавала $75 тысяч, а цяпер — каля $53 тысяч. Эксперты чакаюць, што зніжэнне цэнаў працягнецца і летам.

**СМ; БЕЛТА, БелаПАН, westki.info**

## КУР'ЁЗЫ

### Паляк наняў прастытутку для 14-гадовага сына

**Прастытутка аказалася паліцыянткай у штацкім, і заклапочанага выхаваннем нашчадка бацьку пасадзілі на 10 месяцаў.**

У Брытаніі асуджаны мужчына, які спрабаваў наняць прастытутку для свайго 14-гадовага сына. 42-гадовы мужчына прапанаваў сыну самому выбраць сабе жанчыну. Падлетак спыніўся на жрыцы кахання, якая аказалася... жанчынай-паліцыянткай у штацкім. З ёй мужчына дамовіўся пра цану 20 фунтаў (каля 30 даляраў), і яна села ў машыну, дзе і арыштавала свайго наймальніка.

Сваё жаданне наняць прасталытку чалавек патлумачыў тым, што хацеў дапамагчы сыну стаць мужчынам. Клапатлівы тата восем гадоў таму пераехаў у Брытанію з Польшчы.

Зараз яму прыйдзецца адседзець 10 месяцаў у турме — на столькі суд ацаніў спробу зладзіць сэкс з непаўналетнім.

**МБ**

# Вялікі рок-канцэрт пад Мінскам

**23 траўня адбудзецца першы ў гэтым стагоддзі на тэрыторыі Беларусі вялікі фэст беларускага року на вольным паветры — «Bela Music–09».**

Ад 16 да 23-й пляцоўка аэрадрому «Баравая» прыме лідэраў беларускай актуальнай музыкі. Сярод іх — яшчэ нядаўна забароненыя ўладамі гурты Neuro Dubel і «Палац». На айчынным «оўпэн-эйры» не будзе толькі N.R.M., але на адной сцэне з Варашкевічам і Кулінковічам заспявае Пётр Ялфімаў.

Кіраўнік інфа-цэнтру фэсту Bela Music-09 Сяргей Будкін кажа: «На фестывалі не будзе іерархіі — хэдлайнеры ўсе. Крытэр адзін — яскравая беларуская музыка». На «оўпэн-эйры» як на «оўпэн эйры»: ні табе мулкіх крэслаў, ні загадаў не танчыць у праходах. Стаміўся танчыць? Пасядзі на траўцы і проста паслухай. На тэрыторыі фэсту будуць стаяць гандлёвыя палаткі з ежай і півам (не півам).

### Хто і калі будзе выступаць на «Bela Music-09»:

17:00-17:30 GARADzKIJA
17:30-18:10 Дзецідзяцей
18:10-18:40 RASTOP POWER TRIO
18:40-19:20 Neurodubel
19:20-20:00 Палац
20:00-20:40 Без Билета
20:40-21:20 Крама
21:20-22:00 J:Морс

### Як даехаць

У прынцыпе, гэта недалёка. Пляцоўка на «Баравой» за якіх 300 метраў ад мінскага мікрараёну «Зялёны Луг». Але, адмыслова для неаматараў хадзіць, ад станцыі метро «Усход» да месца фэсту з 15-й да 23-й спецрэйсам туды-назад будуць ездзіць аўтобусы. Кошт квітка на аўтобус — 600 рублёў. Можна дабрацца па-іншаму: гарадскім транспартам да гандлёвага цэнтру «Аквабел» і ад яго прайсці якіх 500 метраў наперад да пляцоўкі, арыентуючыся на ўказальнікі «Bela Music-09».

На полі аэрадрому будзе арганізаваная бясплатная паркоўка. Заезд з аўтадарогі Калодзішчы—Заслаўе. Арыенцір — на ўказальнік Bela Music, кіруйцеся інструкцыямі інспектараў ДАІ.

Квіткі на сам фестываль — 20 тыс. Дзеткі да 10 у суправаджэнні дарослых — задарма. Квіткі можна набыць непасрэдна на імпрэзе, а таксама напярэдадні ў буйных тэатральных касах Мінску.

### Цёмны конік

RASTOP POWER TRIO сярод удзельнікаў? Хто гэта? Гэта Аляксандр Растопчын, удзельнік «Сузор'я» і «Песняроў». У 1990-х з'ехаў у Штаты і, зрабіўшы кар'еру з нуля, лічыцца зоркаю нью-ёркскіх блюзавых клубаў. Разам з Растопчыным з Амерыкі прыедзе яшчэ адна зорка — Аляксей Казлоўскі, нязменны бас-гітарыст гурту «Сузор'е». Да іх далучыцца бубнач Андрэй Філатаў, які калісь таксама граў у «Сузор'і», а цяпер — у «Краме».

### Чаму не будзе N.R.M.?

Лявон Вольскі пасля напружаных гадоў фронтмэн надумаў узяць працяглы адпачынак. Але выступіць сольны праект іншага энэрэмаўца, гітарыста Піта Паўлава, GARADzKIJA.

### Пятро Ялфімаў сярод удзельнікаў?

Так. Перадгісторыя: прыхільнікі Пятра звярнуліся да арганізатараў «Bela Music-09» з просьбай падтрымаць беларускага спевака пасля гісторыі з «Еўрабачаннем». Кіраўнік фестывалю Алег Хаменка пагадзіўся. Тым больш, Ялфімаў браў удзел у «Басовішчы», а адна песня з яго белмоўнага праекту PitBul уваходзіла ў лік найлепшых песняў году паводле версіі інтэрнэт-парталу «Тузін Гітоў».

**Лявон К**



PHOTO.BYMEDIA.NET

# Алег Хаменка: З чыноўнікамі можна дамаўляцца

**Пра канцэрт «Bela Music» гутарка з мастацкім кіраўніком фестывалю, лідэрам гурту «Палац» Алегам Хаменкам.**

**«Наша Ніва»: Алег, раскажыце крыху, што гэта ўвогуле за мерапрыемства такое «Bela Music»?**

**Алег Хаменка:** Гэта будзе такі вялікі беларускі «фестываль фестываляў». Мы вельмі доўга ішлі да такога «оўпэн-эйру», цяпер вось нарэшце ўдалося. Будзе такі вось своеасаблівы канцэрт найлепшага, што ёсць у беларускай музыцы, самага актуальнага. У першую чаргу року. На фэсце будуць жывыя гурты, выканаўцы. Людзі проста змогуць добра правесці вольны час.

**«НН»: Чаго асабіста Вы чакаеце ад фестывалю?**

**АХ:** Чакаю, што фестываль стане знакавым. Найбольш масавым у краіне. Вельмі спадзяюся, што атрымаецца зрабіць яго штогадовым. Калі зможам, то налета плануем праводзіць фэст цягам двух дзён. З удзелам не толькі ўжо вядомых гуртоў, але і маладых. Тых, каго захочуць пачуць самі гледачы.

**«НН»: Ці можна гаварыць, што «Bela Music» можа стаць альтэрнатывай «Басовішчу»?**

**АХ:** Думаю, што не. Гэта два абсалютна розныя мерапрыемствы. Дарэчы, у Баравой таксама будзе гурт, што будзе прадстаўляць «Басовішча», пакуль не хачу казаць, хто менавіта. Прыедуць людзі з «Басовішча», паглядзець як у нас усё пройдзе.

**«НН»: А праблемаў з чыноўнікамі не было падчас падрыхтоўкі фэсту?**

**АХ:** Чыноўнікі таксама жывыя людзі, і з імі можна дамаўляцца. Прызнацца, былі некаторыя непрыемныя моманты, былі складанасці. Але ж такога маштабу фестывалю яшчэ ніколі не было ў Беларусі. Ідэя вельмі слушная, і яна павінна была ўвасобіцца ў жыццё. Усё ж з майго боку ніякіх нараканняў да чыноўнікаў няма.

**«НН»: У суботу вы будзеце граць у Беларусі пад адкрытым небам, тады як яшчэ некалькі гадоў таму давалі паўзабароненыя канцэрты. Адчуванні нейкія новыя ёсць, хвалюецеся?**



**АХ:** Калі ў нас не было вялікіх канцэртаў у Беларусі, то гэта не значыць, што ў нас іх не было ўвогуле. Па вялікаму рахунку, якая розніца, ці ты граеш у Беластоку, Варшаве, Маскве ці ў Мінску? Публіка паўсюль прыкладна аднолькавая.

**«НН»: Якія нечаканкі можна будзе чакаць ад «Bela Music»?**

**АХ:** Паспрабуем зрабіць некаторыя нечаканасці, але хай гэта будзе сюрпрызам. Калі крышачку прыадкрыць таямніцу, то скажу, што магчымым вядучым фэсту будзе Пётр Ялфімаў. Ён таксама спяе некалькі песень. Насамрэч Ялфімаў робіць вельмі актуальную музыку, цікавы праект. Прыедуць з Амерыкі Аляксандр Растопчын і Аляксей Казлоўскі. Магчыма, яны не такія вядомыя ў нас, як там, але гэтыя людзі былі ў складзе першага беларускага рок-гурту «Сузор'е».

**«НН»: Шмат хто цікавіцца, чаму няма N.R.M. Яны адмовіліся ад удзелу?**

**АХ:** Ніхто не адмаўляўся. Справа ў тым, што ў Лявона Вольскага цяпер творчы перапынак. Ён не дае на дадзеным этапе ніякіх канцэртаў.

**«НН»: На якую колькасць людзей разлічваеце, што прыйдзе на фэст?**

**АХ:** Пры добрым надвор'і будзе не меней, чым пяць тысяч чалавек. Галоўнае, каб людзям спадабалася і яны засталіся задаволеныя.

**Гутарыў**
**Зміцер Панкавец**

## ДЫСКАГРАФІЯ

### J:Морс

**Аквамарин, West Records, 2009**

Чакаўся пасля «Адлегласці» ад «морсаў» альбом жорстка рокавы. Але чаду Пугач і К далі па мінімуму (хіба ў песеньцы «Не здавайся»). У астатнім — вырашылі трымацца фірмовага стылю. Да такой ступені, што гурт яшчэ больш стаў нагадваць групу «Браво» з вакалістам Ленцам, асабліва ў самых удалых нумарах — «Серебро» і «Аквамарин». А песня «Металась», наогул, нагадала нешта хлапчуковае, кшталту групы «Корні»: «мікстура» рыфмуецца, вядома ж, з «дура». Але няўдалых песень вобмаль, вакальная харызма Пугача працуе, як належыць. Нават слоўныя выбрыкі, кшталту «негасимый свет новых Че Гевар», з вуснаў Уладзіміра слухаюцца як жыццёвая мудрасць.

Галоўнае пакліканне дыску «Аквамарин» дый усёй творчасці гэтай каманды — стварэнне настрою, атмасферы камфорту і ўтульнасці. Ніякай сацыяльшчыны ў рок-гурту J:Морс нямашака. Калі не лічыць «никто не клянётся и не надо — остаётся только Шенген на год», у астатнім суцэльны музычны рамантызм.

Высноfrom: статус лідэраў айчыннага поп-року гурт пацвердзіў. Яны ў выдатнай музычнай форме, іх музыка мае дайсці да кожнага рамантыка гэтай краіны.

**Сяргей Будкін**

# Шаленства на Кастрычніцкай плошчы

Пра запланаваны ў Мінску маладзёвы марш «За незалежнасць» 14 мая я ведаў загадзя праз абвесткі ў незалежным друку і вельмі спадзяваўся на яго ўзнёсласць, акрыленасць. Спадзяваўся атрымаць якісь жыццёвы зарад, як гэта было ад ранейшых такіх акцыяў. Але перш, чым распавесці, што я ўбачыў на Кастрычніцкім майдане, патлумачу больш глыбокія матывы свайго прыходу на несанкцыянаваную акцыю.

Я нарадзіўся ў суровым 1937 годзе і з прыроды, праз гены, удаўся неабыякавым да лёсу Беларусі. Мяне цікавіла і цікавіць грамадскае жыццё Беларусі ва ўсіх яго праявах, незалежна ад таго, хто яго ладзіць: апазіцыянеры ці афіцыйнае чынавенства. Калі гэтыя імпрэзы сугучныя з духам і менталітэтам нашага народу, я наведваў іх і надалей буду, незалежна ад таго, хто іх ладзіць. От таму я і прыйшоў на моладзевую акцыю 14 мая. І што ж я ўбачыў?

Дзесьці а шостай гадзіне паблізу «Пачатку ўсіх дарог» пачала кучкавацца моладзь. Не паспела яна як след разгарнуцца, як адкульсьці, як крумкачы якія, ва ўсім чорным вылецелі дзецюкі з дубінкамі. Мяне гэты малюнак, як дзіця вайны, глыбока жахнуў. Згадаліся фашыстоўскія аблавы, загоны і згоны. Дык то былі акупанты! А хто гэтыя? Волю якога народу яны выяўляюць?

Пакуль я разважаў, на плошчы пагрозліва папярэджвалі: «Просім усіх разысціся! У выпадку непадпарадкавання да вас будзе прыменена фізічная сіла і адміністрацыйнае пакаранне». Але ніхто з моладзі не варухнуўся. Наадварот. Над маладзёвым гуртам узвіўся бел-чырвона-белы сцяг, а за ім расцяжка «Малады фронт».

Пагроза паўтаралася неаднаразова. А аснову ядра моладзевай акцыі «За незалежанасць» складалі маладзенькія, фізічна кволыя беларусачкі. І менавіта гэта ім пагражалі фізічнай расправаю амонаўскія бэйбусы. Ад пагрозаў амонаўцы перайшлі да здзяйсненняў сваіх метадаў, якія інакш як разбойніцкімі не назавеш. Якраз у гэты момант да нас падышоў якісь хударлявы чалавек.

— Па ўсім відаць, вы — пісьменнікі. Ці не хочаце на канцэрт у Палац Рэспублікі схадзіць? Я і запрашэнні маю...

І от я ў найлепшай канцэртнай зале Беларусі. Як тут усё ўрачыста, гарманічна зладжана, грандыёзна! Адны артыстычныя гурты ў сваіх нацыянальных строях змяняюцца на сцэне іншымі... Украінскі, кіргізскі, таджыкскі, расійскі... Радавалі і беларускія калектывы — «Харошкі», «Грамніцы». З глыбокай задушэўнасцю спяваў песню пра Беларусь і наш слынны Якаў Навуменка. Яго спевы праз праекцыю суправаджаліся маляўнічымі беларускімі краявідамі. Лятуць мірныя птахі буслы... А гэтым часам на Кастрычніцкай плошчы, за нейкую паўсотню метраў ад сцэны, дзеялася зусім іншае... Там панавала грацыя дубінак.

Амонаўцы лютавалі: вырвалі з рук бел-чырвона-белыя сцягі, азвярэла ламалі праз калена дрэўкі. Але з асаблівай лютасцю накінуліся на расцяжку «Малады фронт». Шкуматалі яе ледзь не зубамі.

Амаль дзве гадзіны доўжыўся фестывальны канцэрт. Канцэртная гармонія і грацыя у маім уяўленні мантажна межавалася з тым, што дзеялася на плошчы. Каб я меў магчымасць запісу абедзвюх дзеяў, не сумняюся, спалучэнне ўразіла б і самых амонаўцаў. Шмат каго з іх гэта б змусіла задумацца, чыімі метадамі і з якой эпохі карыстаюцца яны. Людзі, якія былі сведкамі экзекуцыі, называлі іх метады фашыстоўскімі. Ці чулі яны гэта? Ці могуць з гэтым пагадзіцца? Няўжо няма іншых спосабаў размаўляць з моладдзю?

Калі я выйшаў з канцэртнай залы на Кастрычніцкую плошчу, ужо нікога не было. Тады ж падумалася: «А чаму хто з амонаўцаў ці іхняга начальства не сказаў: «Дзецюкі! Дзяўчаткі! Мы таксама і наш прэзідэнт за незалежнасць. Але пра гэта пагаворым з вамі іншым разам. А зараз падымайцеся і ўсе разам, і вы, і мы, пойдзем у Палац Рэспублікі і паглядзім першы фестываль культур народаў ЕўразЭС». Да такога ніхто не дадумаўся. Дый дзе было думацца, калі мозг натрэніраваны толькі на дубінкі, да фізічнай сілы. Гэтыя навыкі амонаўцы, несумненна, павінны мець, але ў дачыненні да каго? Да заўзятых крыміналістаў, рэцыдывістаў. А хіба ж моладзевыя актывісты, якія згуртаваліся чатырнаццатага мая, такія?! Яны ўсе палымяна любяць Беларусь. І за гэта на іх дубінкамі?! Не, з гэтым аніяк нельга пагадзіцца! Трэба шукаць іншыя шляхі размовы з моладдзю. Яна ж наша будучыня. І што ж яна запіша ў аналы нашай гісторыі? Ці не тое, што я тут занатаваў? Дзень 14 мая 2009 году ў аналы беларускага народу, хоча гэтага хто ці ні хоча, будзе запісаны як дзень шаленства цяперашняй адміністрацыі. Але як бы яно там ні было, але наша моладзь 14 мая праявіла крок найвышэйшай мужнасці, і яе павінны падтрымаць усе, каму неабыякавы лёс Беларусі і яе будучыня.

**Уладзімір Содаль, Мінск**

## ВОДГУКІ

### «Таццяна Бумажкова: Я зразумела» (№18)

«У пачатку 1990-х я з камсамольскім імпэтам стала выдаваць газету «Славянские Ведомости». Але хутка сама ж яе і зачыніла. Бо калі пайшла інфармацыя, раней закрытая, у мяне валасы ўсталі дыба! Мы ж былі ўпэўненыя, што савецкая ўлада маральная. Так, ёсць асобныя недахопы, але ў цэлым гэта справядлівы лад. І тут я зразумела, што гэта не так. Ілгаць чытачам не хацела. Балюча было разумець, што наўмысна цябе зрабілі сляпым, дурным...»

Які фальш. Бумажкова пісала свае пасквілі тады, калі раней закрытая інфармацыя ўжо лілася няспыннай плынню, і любому разумнаму чалавеку было гэтага дастаткова, каб прасвятлець. Ва ўсялякім выпадку, ужо пасля адкрыцця Курапатаў гэта ўсё было дакладна. Бумажкова якраз і змагалася з тымі, хто прасвятляўся, і імкнулася супрацьпаставіць партыйную артадоксію «раней закрытай інфармацыі», кляймуючы апанентаў у лепшых традыцыях савецкага агітпропу. Адно шчасце толькі — што «гісторыі ходу не супыніш слінай».

Такія заявы мне нагадваюць «прасвятленні» некаторых нашых цяперашніх апазіцыйных дзеячаў, якія верай і праўдай служылі Лукашэнку, а пасля са здзіўленнем заўважылі, што ў краіне няма дэмакратыі і парушаюцца правы чалавека. Прытым чамусьці «прасвятленне» адбываецца пасля адстаўкі (дакладней кажучы, адсоўвання ад карыта). У мяне няма веры да падобнага кшталту людзей.

**Ales Jurkaviec**

***

У кожнага свой шлях да справядлівасці. Я наўмысна не кажу: да Беларушчыны, бо, бывае, гэтыя разуменні не супадаюць. Прыйшоў чалавек да таго, што Вы зразумелі значна раней — дык што, яго кляйміць трэба? Гэтак і будзем у стане грамадзянскай вайны жыць. Замест прымірэння і цывілізаванага жыцця. Як гэта робяць іншыя. Даравацьтрэба і перацягваць на свой бок. Тады і завалім лукашызм.

**шматдзетны бацька**

***

Мой дзед Пётр Адамавіч Стэфановіч быў партызанам у брыгадзе, камандзірам якой быў Бумажкоў. Рудобельская партызанская зона (цяпер Акцябрскі р-н Гомельскай вобласці). Дзед і ягоныя браты былі адтуль родам, з вёскі Буда і хутароў, якія былі раскіданыя ўздоўж ракі Арэсы. Жахлівы быў час. Немцы праводзілі «зачысткі», палілі вёскі, часам з жыхарамі. Буду падчас вайны двойчы знішчалі. Браты майго дзеда Адольф і Баляслаў загінулі ў тым пекле.

У той жа час мой прадзед Уладзімір Заброцкі, які настаўнічаў у гэтай вёсцы, быў расстраляны партызанамі 9 мая 1942 году (трэба ж такое супадзенне па даце) разам са сваім сынам. Як казала бабуля, ён заступіўся за сялянаў, якіх рабавалі партызаны. Там, у Будзе, ён і пахаваны. Быў летась я на ягонай магілцы.

Адукаваны чалавек быў, скончыў Нясвіжскую настаўніцкую семінарыю, быў да рэвалюцыі дырэктарам пачатковай школы пад Баранавічамі (Гарадзішча).

Жахлівыя часы былі. Дзед казаў, што як ён з войска ў 1941-м дахаты вярнуўся, дык выбар быў адзін: ці ў лес, ці ў паліцыю. Ён з братамі ў лес пайшоў. Саветаў ён не любіў, але Радзіму любіў.

Цяпер дзеда няма, а я б запытаўся ў яго пра Бумажкова... Бумажкову, дарэчы, у Акцябрскім помнік стаіць.

**pravaabaronca**


**Еўрапейскі Гуманітарны Універсітэт**

працягвае набор студэнтаў на бакалаўрскую праграму «Гісторыя Беларусі і культурная антрапалогія» Еўрапейскага Гуманітарнага універсітэту. Навучанне ў ЕГУ гэта:

— авалоданне дзвюма еўрапейскімі мовамі;

— фундаментальная падрыхтоўка ў галіне гуманітарных і сацыяльных навук;

— грунтоўныя веды па беларускай, еўрапейскай і сусветнай гісторыі, археалогіі, этналогіі, культурнай антрапалогіі, гісторыі мастацтва;

— магчымасць вучыцца ў «Крывіцкай Мэцы» — у Вільні;

— атрыманне дыплому літоўскага дзяржаўнага ўзору, які прызнаецца ў Еўропе.

Бакалаўрская праграма «Гісторыя Беларусі і культурная антрапалогія» ЕГУ была распрацаваная з улікам патрабаванняў, якія прад'яўляюцца да выпускнікоў гістарычных факультэтаў універсітэтаў Еўропы. Яна дае грунтоўныя веды па гісторыі Беларусі і Еўропы, а таксама ў галіне сацыяльнай, культурнай і гістарычнай антрапалогіі і іншых гуманітарных дысцыплін.

У праграме занятыя вядомыя беларускія гісторыкі, якія паспяхова спалучаюць выкладанне і навуковую дзейнасць. Акрамя таго, студэнты знаёмяцца з такім варыянтам гісторыі, дзе ў цэнтры ўвагі знаходзіцца ЧАЛАВЕК з яго поспехамі і расчараваннямі, радасцямі і нягодамі.

Выкладанне вядзецца пераважна па-беларуску, на старэйшых курсах таксама і па-англійску, па-французску ці па-нямецку. Апроч гэтага прапануецца асобны курс літоўскай мовы і культуры.

Выпускнікі праграмы змогуць працаваць навуковымі супрацоўнікамі музеяў, экскурсаводамі, выкладчыкамі гістарычных дысцыплін, выступаць у якасці эксперта ў па праблемах гістарычнай спадчыны, праводзіць самастойныя даследаванні ў вобласці гістарычнай навукі або працягнуць навучанне ў магістратуры.

Праграма прапануецца як у дзённым, так і ў завочным фармаце.



## Збяры Кнігарню «Наша Ніва»



















ПЫТАЙЦЕСЯ Ў КНІГАРНЯХ І Ў НЕЗАЛЕЖНЫХ РАСПАЎСЮДНІКАЎ

# Вайцюшкевіч здымае болі

«Сёння 14-е, але няважна, што было калісьці даўно. Мова была і ёсць, і застанецца. І будуць з намі Пагоня і бел-чырвона-белы сцяг!» — такімі словамі Зміцер Вайцюшкевіч пачаў прысвечаны 105-годдзю беларускага паэта-песенніка Адама Русака канцэрт. Малая зала «Казы» была традыцыйна поўная. Кажучы пра Адама Русака, Вайцюшкевіч адзначыў, што яговыя песні аб'ядноўваюць левых і правых, заходнікаў і ўсходнікаў. Песні гэтыя даюць надзею на тое, што ўсё будзе добра. Адзін з вершаў паэта прачытала яговая дачка Людміла Русак.

Ад самага пачатку намаганнямі музыкі канцэрт ператварыўся ў сумесь маналогаў (навіна пра нараджэнне сына Язэпа была сустрэтая авацыямі), майстар-класаў па вакале ды музычнай тэрапіі. Вайцюшкевіч прызнаўся, што адна з яговых прыхільніц заявіла яму неяк, што яговыя спевы знімаюць у яе болі, а напрыканцы канцэрту ў тым самым прызналася адна з глядачак.

На сцэне акрамя банэраў камерцыйных спонсараў («бізнес галасуе кветкамі на канцэрт»), інфармацыйнага партнёра — кампаніі «Будзьма», быў змешчаны экран, на якім у часе выступу паказвалі то дакументальную кінахроніку (пад партызанскія песні), то здымкі сям'і Русакоў, а пад песню «Мой край» на экране кружлялі буслы, ды жанчыны ў народных строях круцілі снапы.

«Мару, каб у беларускім войску спявалі беларускія песні», — сказаў Зміцер, і аркестр у маршавай стылістыцы зухавата зайграў «Пошукі адказаў».

«Вось каб пачуў у якім Доме афіцэраў гэтую песню міністр абароны, то глядзіш, і сталі б яе нашы хлопцы ў войску спяваць. І я афіцэра атрымаў бы, мо нават вышэй за прапаршчыцу Смолаву быў бы», — пажартаваў Зміцер.

Адным з сюрпрызаў вечару быў выхад на сцэну ўнучкі Русака Крысціны, якая заспявала разам з Вайцюшкевічам. Гледачы былі ў захапленні, а Зміцер дык так расхваляваўся, што ніяк не мог прыгадаць словы наступнай песні. «Сэрцашчыпацельная» (як кажуць на Падляшшы) балада «Даніла», а таксама «Не заходзь ты, сонейка» ў акапэльным выкананні Ксеніі Мінчанкі слухаліся на адным дыханні.

«Беларусам трэба ведаць паболей сваіх песень, бедную «Купалінку» зацерлі да дзірак!» — казаў музыка. — Кожны нармальны беларус павінен ведаць не толькі адзін куплет «Бывайце здаровы» пра чарку і скварку. Чарка і скварка — аснова ўсёй нашай ідэалогіі. Трэба ведаць усю песню. Дзякуй Надзі Бабкінай, што спела, але арыгінал — наш!»

Фіналам канцэрту (гэта гледачы думалі, што падышоў фінал) стала калектыўнае фота на памяць усёй залай разам з аркестрам і яго нястомным кіраўніком: «Мы цяпер паўсюль так робім: і ў Віцебску, і ў Навагрудку». І ўжо калі публіка пацягнулася да выхадаў, Вайцюшкевіч папрасіў затрымацца і праспяваў разам з скрыпачкай Ксеніяй «Развітанне з Радзімай». Стоячы, зала выслухала на біс (па шматлікіх настойлівых просьбах) «Прыйдзі, мой каханы!»

**Сямён Печанко**




**Вайцюшкевіч з унучкай Адама Русака Крысцінай.**

# Перазагрузка коду Да Вінчы

Коддавінчыяда працягваецца. Паміраe стары Папа. Падчас абрання новага тэрарысты, чые сляды цягнуцца з глыбіні стагоддзяў, бяруць колькі кардыналаў-прэтэндэнтаў у закладнікі. У адказ ватыканская паліцыя (такая, ёсць і такая!) тэрмінова выпісвае з Амерыкі нашага старога знаёмца прафесара-клаўстрафоба, спеца па таемных таварыствах і сакрэтных сімвалах Роберта Ленгдана (ён жа Форэст Гамп назаўсёды Том Хэнкс).

Будзе ўсё: і шматразовыя незаконныя перасячэнні італьяна-ватыканскай мяжы, і прымусовае купанне кардыналаў у басейне, і добраахвотныя палёты камергераў на верталётах, і нямецкамоўныя з акцэнтам швейцарскія гвардзейцы, і намеры абраць першага ў гісторыі Папу-Рэмба...

Лаўры аўтара «Імя ружы», Умберта Эка, які паралельна і незалежна ад Караткевіча, вынайшаў гістарычны дэтэктыў, не даюць спакою Дэну Браўну. Важна, каб глядзелася і павучальна, і захапляльна. Каб гісторыя разгадвалася як судоку. Хіба, у адрозненне ад «Дзікага палявання караля Стаха», ты — зануранны ў тунэлі і лабірынты гістарычных таямніцаў, але ахвочы выйсці на свет божы, да людства — ля дзвярэй натыкаешся на надпісанню вытанчаным гатычным шрыфтам шыльду «выхаду няма». Па такіх кніжках не нудна вучыць англійскую, на экранізацыях паводле гэтых кніжак прыемна цалавацца на апошнім шэрагу. Ці размаўляеце вы па-ватыканску?

**«Анёлы і дэманы»**, містычны трымценнік, ЗША, 138 хв.

**Чаму варта глядзець гэты фільм:**

1.Каб убачыць, якая сувязь паміж абраннем Папы і Вялікім адронным калайдэрам.

2.Каб убачыць чарговую дзеўчыну Бонда, прабачце, чарговую сяброўку прафесара Ленгдана. Пасля француженкі Одры Тоту гэты цяжар упаў на плечы зоркі ізраільскага кіно Аелет Зурэр, якая ўвасабляе фізіка-практыка і дэтэктыва-аматара.

3.Каб па выхадзе пасля сеансу з кінатэатру «Масква», завітаўшы ў старасвецкія дворыкі Ракаўскага прадмесця, абмінуўшы рэзідэнцыю экзарха і непрыступную Петрапаўлаўскую царкву (якая за саветамі, дарэчы, была архівам), разыграць у думках свой гістарычны дэтэктыў на мясцовым грунце.

## СЦІСЛА

### У Мінску з'явіліся скверы Траецкая Гара ды Лютэранскі

Шэраг безыменных сквераў і паркаў у Мінску атрымалі назву. Прычым ад даўніх тапонімаў. Так, безыменны сквер у межах вуліцаў Купрыянава—Лібкнехта—зав.Дамашэўскі цяпер завецца Лютэранскі. Гэты сквер з'явіўся на месцы знесеных у 1970-я гады Лютэранскіх могілак.

Траецкая гара — гістарычная назва ўзгорку, на якім цяпер стаіць Опера.

Запраектаваны парк у мікрараёне «Сухарава-5» каля рэчкі Качынка будзе звацца Дзівіелка. Там, у даліне, была калісьці рэчка пад такой назвай.

Старосцінская слабада — гэта назва старажытнага мінскага прадмесця перад Старажоўкай. На гэтым месцы ў XVI—XVIII стст. пражывалі людзі, якія арандавалі ў мінскага старасты зямлю.

### Кінафэст у Каннах: бляск і крызіс

Першы раз за 62 гады існавання кінафэст у Каннах распачаўся мультфільмам. «Угору» (Up) — анімацыйная стужка амерыканскага рэжысёра Піта Доктэра. Сюжэт: стары спраўджвае мару аб падарожжы ў паветры, прывязаўшы тысячы паветраных балонікаў да сваёй хаты. Дзякуючы агучванню ў мультфільме вакальных нумароў, на чырвоны дыван Каннаў ступіць Шарль Азнавур.

**БелаПАН; АГ; ЛК**




# Беларусь праз рамку National Geographic

У Варшаве пад эгідай National Geographic выйшаў турыстычны дапаможнік пра Беларусь, укладзены англійскім падарожнікам, ілюстраваны фотамі Юліі Дарашкевіч. Гэтак хораша, аж хочацца паехаць да самога сябе ў госці.

Першыя два раздзелы — агульная інфармацыя пра Беларусь: гісторыя, культура, галоўныя беларускія славутасці, даведка пра шляхі злучэння і г.д. Потым па раздзеле на кожны з шасці абласных гарадоў: транспарт, месцы адпачынку, дзе і як смачна і танна паесці. Крытычная ацэнка асноўных беларускіх гатэляў, не забыўшы пра выгадных бакі. Акрамя таго, архітэктурныя славутасці па-за межамі вялікіх гарадоў (Мір, Нясвіж, Полацк). Прыгаданыя і атракцыі, створаныя нядаўна: Дудуткі і «Лінія Сталіна».

«НН» пісала пра аўтара турыстычных нататкаў пра Нёман па-нямецку Увэ Рада. На яго думку, за цяперашнім светам на еўрапейскім кніжным рынку можна заўважыць такую тэндэнцыю: чытачы-падарожнікі больш не хочуць адно сухіх турысцкіх звестак. Цяпер аўтары на патрэбу спажыўца мусяць узбагаціць дапаможнікі літаратурнымі, цалкам суб'ектыўнымі, замалёўкамі і цікавосткамі.

Аўтар турыстычнага дапаможніку National Geographic пра Беларусь, Найджэл Робертс, пайшоў тым самым шляхам: спалучыў карысную інфармацыю (дзе спыніцца на ноч, курс мясцовых валютаў і г.д.) з аўтарскімі нататкамі «Шатанскі напой» (зацемы пра беларускую гарэлку) і «Марк Шагал» (іранічна-біяграфічныя развагі, ці ж Віцебск — другі Парыж, ці то, наадварот, Парыж — усё ж другі Віцебск).

З турыстычнага дапаможніку выйшла сама па сабе захапляльная экскурсія па Беларусі, а эфект падабенства да турыстычнай выправы ўзмацніўся дзякуючы здымкам фотакарэспандэнткі «НН» Юліі Дарашкевіч. Некаторыя памылкі аўтара — сярэднявечная Літва ўпарта называецца суседкай сярэднявечнай Беларусі — ніяк не замінаюць пачуццю, што нарадзілася пасля прачытання-вывучэння гэтага дапаможніку: хочацца паехаць да самога сябе ў госці.

**Лявон К**

# Звацца Юдам забаронена

Піша **Наталка Бабіна**, што пабывала ў Берліне ў музеях Штазі і Берлінскай сцяны.

### Штазі і КДБ: хто круцейшы

Мянушкі маглі быць любымі: імёны літаратурных ці гістарычных персанажаў, назвы прадметаў — усё, што хочаце. Агентам Штазі забаронена было толькі браць мянушку «Юда». Афіцэры Штазі ніколі не пагаджаліся, каб завербаваны імі грамадзянін выбіраў сабе такі псеўданім. Яны лічылі, што праца ў спецслужбе не мае з дзейнасцю гэтага вядомага персанажу нічога супольнага, і няма чаго пра яго ўспамінаць...

На кожных 180 грамадзянаў ГДР прыпадаў адзін супрацоўнік Штазі. (У былым Савецкім Саюзе 1 кэдэбіст быў на 595 грамадзянаў, у сацыялістычнай Польшчы — на 1594.)

З нямецкай метадычнасцю Штазі ахапіла сваёй дзейнасцю кожнага.

«Справа» заводзілася яшчэ падчас навучання ў школе і «пухла» на працягу ўсяго жыцця грамадзяніна. Але нягледзячы на гэта, рэвалюцыя ў былой ГДР адбылася мірна і хутка, дзякуючы чаму ўвесь агромністы архіў Штазі захаваўся і стаў даступным грамадскасці.

А ў цэнтры вялікага кварталу, які займала гэтая арганізацыя ў Берліне, у доме, дзе месцілася найвышэйшае кіраўніцтва, цяпер — музей. І адзін з кіраўнікоў яго, Увэ Хільмэр, водзіць нас па экспазіцыі. Нязмушана абапёршыся на гранітны бюст Дзяржынскага, які ў свой час падарылі нямецкім калегам дзеячы з Лубянкі, расказвае і паказвае, чым і як займалася тое гэдээраўскае КДБ. А я лаўлю сябе на думцы, што мне гэта, як у той рэкламе, «нешта нагадвае»...

У першыя дзесяцігоддзі існавання ГДР у краіне было шмат палітычных зняволеных. Анекдот пра кіраўніцтва краіны, расказаны калегу па працы ці знаёмаму ў кавярні — ярлык нацыста і 2,5 гады турмы. Але з цягам часу, пад ціскам Захаду, настала «лібералізацыя». І метады працы Штазі памяняліся.

Кіраўнічка падпольнай апазіцыйнай групы дабіраецца на працу і на паседжанні групы на ровары — супрацоўнік Штазі цікуе за ёй і рэгулярна прабівае колы ровара. Жанчына нервуецца, усюды спазняецца, пачынаюцца праблемы на працы... (Колькі разоў прабівалі колы Вашай машыны, сп. Мілінкевіч?)

Пастар лютэранскай царквы мае актыўную грамадзянскую пазіцыю. Каб паралізаваць яго дзейнасць, афіцэр-куратар з Штазі распрацоўвае план, як дабіцца, каб праз 6 месяцаў жонка пастара падала на развод. Да яе падсылаюць прыгожага рамантычнага маладзёна, які, аднак, пасля разводу знікае. Але справа зробленая. (Дарэчы, пасля аб'яднання Германіі, калі святар і яго былая жонка пазнаёміліся са сваімі справамі і даведаліся праўду, сям'я зноў з'ядналася.)

Штазі яшчэ ў школе пачынала адсочваць моцных і актыўных дзяцей, якія ў будучыні маглі б стаць апазіцыйнымі лідэрамі. Рабілася ўсё, каб не даць ім атрымаць атэстат і перашкодзіць вучыцца далей, аб чым захавалася шмат дакументаў. (Ваня Шыла, гнюснасць, з якой ты сутыкнуўся, была масавай у ГДР. Можа, адтуль і быў пераняты досвед?)

Вось вы думаеце, што гэта палівачка? Ды не, гэта фотаапарат. Такую «палівачку» «забываліся» на адной з магілаў, калі хавалі каго з апазіцыянераў, і атрымлівалі здымкі тых, хто прыходзіў на пахаванне.

А вось гэты аб'ектыў у шпакоўні, наадварот, нічога не мог здымаць — ракурс вельмі вузкі. Але такія «шпакоўні» наўмысна развешвалі ў парках, каб прагнаць адтуль моладзь у месцы, дзе за ёй віжаваць зручней. (У нас палівачкі і шпакоўні ператварыліся ў апаратараў КДБ, якія на мітынгах і судах дэманстратыўна здымаюць прысутных на відэа. На судзе над рэдактарам «НН» у 2006-м адзін такі прышчавы нават папрасіў: «Будзьце ласкавы, прапусціце, калі ласка, наперад», — на што Алена К., загароджваючы яго спінай, адказала: «Ага, зараз!»)

«Увогуле, — кажа сп.Хільмэр, — Штазі імкнулася, каб яе супрацоўнікаў лічылі людзьмі недалёкімі, дурнямі, якіх лёгка падмануць, абмежаванымі службістамі. Тады Штазі было б лягчэй трымаць грамадства пад кантролем». (Цікава, калі Сухарэнка вяшчаў пра пацукоў у водаправодзе, ён таксама імкнуўся да падобнай мэты?)

А якую пенсію, да слова, атрымае Сухарэнка? Пытанне пенсіі для былых супрацоўнікаў Штазі балючае ў Германіі. Яна ў іх на траціну большая, чым у астатніх пенсіянераў. Адразу пасля ўз'яднання Германіі палажэнне аб падвышанай пенсіі для былых супрацоўнікаў спецслужбаў былі адмянілі, але памянёныя супрацоўнікі звярнуліся у Канстытуцыйны суд аб'яднанай краіны, і суд вынес вердыкт, што дзейнасць палажэння трэба ўзнавіць, бо «людзі, якія ішлі на працу ў гэтыя органы, на яго разлічвалі»... Што зробіш — прававая дзяржава.

### Прапаганда: паралелі

73-гадовы прафесар Пэтэр Шывы, былы кіраўнік тэле- і радыёканалу NDR, за сталом у кавярні «Куток канцлера» гаворыць павольна і спакойна: «Я скажу парадаксальную рэч: нам, немцам, вельмі пашанцавала, што мы прайгралі вайну. Гэта дазволіла нам пачаць усё з чыстага ліста, улічваючы былыя памылкі. У сферы сродкаў камунікацыі галоўная выснова з трагічнай гісторыі вайны была наступнай: ніколі больш ніводзін палітык не павінен з'явіцца ў эфіры ці на газетнай старонцы без таго, каб побач не з'явіўся ягоны палітычны праціўнік. Гледачы і чытачы павінны ў аднолькавай меры быць праінфармаваныя пра розныя палітычныя пазіцыі. Страшная фашысцкая старонка ў гісторыі Германіі — вынік таго, што Гебельсу ўдалося ў кожным нямецкім доме ўсталяваць радыёкропку, праз якую немцаў бесперапынна пераконвалі ў беспамылковасці шляху нацыянал-сацыялізму, у геніяльнасці фюрэра...»

Калега з газеты «Беларусы і рынак» сп.Скуратовіч заўважае: «Каб дабіцца таго, што на экране і ў газетах у Беларусі будзе не толькі адзін палітык, нам, мусіць, трэба вечарам аб'явіць вайну Еўрасаюзу, а раніцай капітуляваць і пачаць усё з чыстага ліста...»

«Думаю, войскі Еўрасаюзу не ўвойдуць на тэрыторыю вашай краіны, — пасміхаецца сп.Шывы. — Мусіць быць іншы шлях».



**Такія «шпакоўні» з псеўдакамерамі наўмысна развешвалі ў парках, каб прагнаць адтуль моладзь у месцы, дзе за ёй віжаваць зручней.**

Дзякуючы нямецкаму Фонду Адэнаўэра, група беларускіх журналістаў недзяржаўных выданняў правяла тыдзень у Берліне. Арганізатары паездкі імкнуліся паказаць журналістам з Беларусі — краіны, у якой дзяржаўная прапаганда адрадзіла таталітарныя каштоўнасці, — чым гэтыя таталітарныя каштоўнасці абярнуліся для Германіі і немцаў, і як жыве краіна зараз, праз дваццаць гадоў пасля таго, як аб'ядналася на аснове зусім іншых каштоўнасцяў — дэмакратычных. Сярод групы журналістаў была і я.

Пасля ўсіх сустрэчаў у Берліне: з дэпутатамі Бундэстагу і ландтагу Брандэнбургу, гісторыкамі, архівістамі, журналістамі, былымі вязнямі гэдээраўскіх турмаў, музейнымі працаўнікамі я зразумела, што насуперак стэрэатыпу, у Германіі больш ведаюць пра Беларусь, чым у Беларусі — пра Германію.

Уражанняў ад паездкі было шмат. Раскажу пра тыя, якія прыводзілі да відавочных паралеляў з беларускім жыццём.






**Такую «палівачку» «забываліся» на адной з магілаў, калі хавалі каго з апазіцыянераў, і атрымлівалі здымкі ўдзельнікаў пахавання.**



### Паліткарэктнасць? Не, дзякуй!

Тыя ўсходнія немцы, што маюць уладу і ўплыў у сённяшняй Германіі, прайшлі праз многія выпрабаванні у часы ГДР: розныя тэрміны турэмнага зняволення, высылкі, правакацыі спецслужбаў. Пра гэтыя факты сваёй біяграфіі расказвалі многія з тых, з кім мы сустракаліся. Прычым маштаб і жорсткасць рэпрэсіяў былі такімі, што сучасная Беларусь на гэтым фоне выглядае домам адпачынку.

Там, дзе месціўся памежны пункт паміж Заходнім і Усходнім Берлінам, на былым пераходзе «Чэкпойнт Чарлі», цяпер таксама музей. Тут нас сустракае журналіст Райнер Шуберт. У часы ГДР ён дапамагаў людзям уцякаць у Заходнюю Германію. Спробы трапіць за Берлінскі мур тады былі вельмі небяспечнымі і часта скончваліся гібеллю: ахова мяжы ГДР была вельмі шчыльнай, і салдаты мелі прыказ страляць ва ўсіх парушальнікаў. Але людзі ўпарта імкнуліся «за сцяну» і прыдумлялі розныя спосабы: падкопы, тайнікі ў аўтамабілях... Менавіта ў тайніку, у багажніку аўтамабіля, сп.Шуберту ўдалося вывезці ў ФРГ некалькіх сваіх сяброў. Аднойчы яму ў Заходні Берлін пазваніў сябар Крыстыян, наступны ў чарзе на перавозку, і падчас размовы сказаў умоўленую фразу, якая азначала: прыязджай, я гатовы. Калі Райнер прыехаў, яго схапілі: аказваецца, Крыстыян трапіў у Штазі і там з яго выбілі згоду на супрацоўніцтва... Райнера схапілі адразу пасля пераезду і судзілі. Ён атрымаў 15 гадоў турмы, з якіх адседзеў 9, пасля чаго яго абмянялі... Сп. Райнер расказвае і паказвае на слайдах, у якіх умовах ён правёў гэтыя 9 гадоў.

Экскурсію па музеі вядзе для нас яго калега Рудзі. Ён таксама дапамагаў людзям з ГДР трапіць на Захад: рабіў падкопы з заходняга боку. І настолькі ўдала, што Штазі не ніяк не магло яго нейтралізаваць. Кіраўнік спецслужбы, генерал Мільке, асабіста выдаў загад забіць яго (Рудзі дэманструе нам ксеракопію). У загадзе супрацоўніку Штазі прадпісваецца паехаць у Заходні Берлін, высачыць Рудзі, у пэўным месцы ўдарыць яго па галаве тупым прадметам вагой не меней за 1 кг, а пасля аднесці цела ў хмызняк, каб імітаваць напад з мэтай рабунку... Такіх загадаў датычна розных людзей было шмат. Генерал Мільке пасля аб'яднання Германіі правёў у турме некалькі месяцаў і быў адпушчаны — па стане здароўя...

«На маім аўтамабілі налепка: «Паліткарэктнасць? Не, дзякуй!» — гаворыць сп. Шуберт. — Я ніколі не прабачу ім. Я ніколі не пагаджуся, каб гэтыя людзі зноў увайшлі ў сілу ў маёй краіне. А яны спрабуюць».

...Усё ж такі Юда мае дачыненне да дзейнасці любога чалавека, які забывае пра чалавечае ў сабе і людзях. Крыстыян, які здрадзіў сябру, цяпер, праз дваццаць гадоў, жыве ў Берліне і кажа, што ўсё забыў.

Пра што будзе памятаць праз дваццаць гадоў Сцяпан Сухарэнка? Міністр Радзькоў? Прышчавы кэдэбіскі апаратар?

Пра што будзеце памятаць праз дваццаць гадоў Вы?

Альтэрнатыўная гісторыя — у рамане Людмілы Рублеўскай «Забіць нягодніка, альбо Гульня ў Альбарутэнію». Піша **Даніла Жукоўскі**.

# Пра што крык?

Паводле сюжэту гэта фантастыка на адвечную тэму альтэрнатываў у гісторыі. Група нашых сучаснікаў, маладзёнаў, якіх паводле эміграцыйнае класіфікацыі трэба было б называць «сведамымі беларусамі», атрымлівае доступ да пэўнага каналу ў 30-я гг. XX ст. беларускай сталіцы.

Іхнія вылазкі туды не прыводзяць да радыкальных зменаў у гісторыі, але блізка знаёмяць з жудаснай рэчаіснасцю бальшавіцкага тэрору. Таварышы ратуюць з мінулага чалавека, уцягнутага чэкістамі ў злачынны механізм рэпрэсіяў у якасці ахвяры і правакатара, — асобу моцную і неардынарную. Адна з сяброўак дарыць яму сваё каханне, але ён усё адно вяртаецца «дадому» дзеля выканання абавязку перад сябрам і насустрач сваёй гібелі. Перажытае спрычыняецца да імклівага сталення што саміх сябрукоў, што адносінаў паміж імі.

«Гульня ў Альбарутэнію» напісаная як кінараман. Дыялогі часам нацягнутыя, часам эскізныя, але «відэашэраг» аднаўляе станоўчыя ўражанні. Старасвецкая хатка ў лабірынце мінскіх завулкаў, вітраж з савецкай сімволікай у акне універсітэцкай лабараторыі, нарэшце, сцэна з пранікненнем Скаловіча ў цягнік — усё атрымалася пераканаўчым і змястоўным. Прадуманы шэраг выразных ландшафтаў і інтэр’ераў утварае структуру, якая падтрымлівае дзеянне, візуальная дэталёвасць дапамагае стварыць з вядомых сюжэтных хадоў самабытны твор.

Кароткі пераказ зместу «Гульні...» наўрад ці аддае раману належнае. Уласна кажучы, тым раман і цікавы, што цікавасць да яго не вынікае наўпрост ані з сюжэту, падзей і калізій, ані з яго дыдактычнага паслання.

Тэкст нашмат цікавейшы, калі разглядаць яго як разгорнутую рэпліку ў «дыспуце» вакол беларускай ідэі, якая стараннямі Валера Булгакава займае апошнім часам шмат месца на старонках рэдагаванага ім інтэлектуальнага месячніку ARCHE.

## Забітыя і памерлыя

Тэкст спадарыні Рублеўскай з асабліваю сілай нагадвае нацыянал-пурыстам навукова гэта або не, але для выхаванцаў найнуўшай хвалі Беларускага Адраджэння найпрыцягальнейшыя сімвалы Беларусі — не лапці і саха, а замкі і рыцары ў мінуўшчыне, не аратыя ці ганчары, а музыкі, палітыкі і мысляры ў сучаснасці. Дарэчы, прыгадаўшы працы Ластоўскага, ці не тое самае можна казаць і пра прадстаўнікоў папярэдняе хвалі? Менавіта альтэрнатыўная гісторыя (то бо, гістарычныя міфы), нагадвае сп-ня Рублеўская, іншы раз замацоўваецца ў галовах і сэрцах людзей і адыгрывае важнейшую ролю, чым гісторыя сапраўдная.

Калі б першае пакаленне беларускіх творцаў савецкай эпохі ўлады СССР не папапілі б у іхняй уласнай крыві, дык даробак маладнякоўцаў, узвышэнцаў ды інш. істотна прыцьміў бы няпэўную з навуковага гледзішча і малазразумелую сялянскім сынам феадальна-шляхецкую старасвеччыну.

Але рэпрэсіі, якія не маглі закрануць Льва Сапегу, а Францыска Скарыну прымусілі толькі ўзяць псеўданім Георгій, раз і назаўсёды пазбавілі нас сотняў маладых сыноў маладой Беларусі.

Can the subaltern speak? У беларускім выпадку кананічная фраза гучыць неяк нявыварат: можа, той прыгнечаны ў дадзены момант мала што можа сказаць, але, пакуль ён жывы, у яго захоўваецца шанец выказацца, а калі ён ужо выказаўся (ды яшчэ і памёр сваёй смерцю да пачатку тэрору), застаецца шанец, што ягонае слова захаваецца і будзе кімсьці калісьці пачутае.

Масавыя забойствы беларускіх інтэлігентаў — вось прычына, чаму не ідэалы сялянскае гушчы, а шляхецка-сарматкія міты зрабілі беларусамі герояў сп-ні Рублеўскай (і ці толькі іх?).

Verba volant, scripta manent. Пісьменніца нагадвае аўтарам ARCHE і ўсім іншым простую, але страшную і багатую наступствамі рэч: беларуская нацыянальная ідэя кволая не (толькі) таму, што ўтварылася позна, але яшчэ і таму, што, толькі-толькі ўстаўшы на ногі, трапіла пад знішчальны каток бальшавізму. А вось раскіданыя па свеце старадрукі ды створаныя за стагоддзі велічныя будынкі замкаў рэжым знішчыць не патрапіў...

## Хто ёсць who?

Важкае слова падначаленай Паўла Якубовіча істотна псуе пазіцыі рэдактара ARCHE, бо «Гульня...» робіць гэтак нам неабходны крок ад выкрывання да асэнсавання.



**Людміла Рублеўская. Забіць нягодніка, альбо Гульня ў Альбарутэнію.** Раман–інструкцыя// Дзеяслоў. 2008. № 33–34.

Тэма масавага тэрору наўрад ці асуджаная на шырокую папулярнасць. Сп-ня Рублеўская знайшла свой спосаб гаварыць пра тое, што гісторыя краіны Саветаў пачалася з дзікай разні, і што многія паважаныя дзяржаўныя дзеячы паводзілі сябе ў свой час не лепш за эсэсаўцаў.

Л.Маракоў (ягоную кнігу «Толькі адна ноч» я ўвесь час згадваў, чытаючы раман Рублеўскай як неацэнны збор жыццяпісаў насельнікаў Мінску страшных часоў камуністычнага тэрору) і іншыя даследнікі рэпрэсіяў могуць ганарыцца: іхняя праца падтрыманая буйным літаратурным творам.

Нельга змяніць мінулае, але, зразумеўшы яго, можна змяніць тое, як мінулае ўплывае на сучаснасць і будучыню. Пра гэта сп-ня Рублеўская гаворыць метафарычна. Але ў ейнай метафарычнасці больш празрыстасці, чым у навукападобных разважаннях наконт большай аргументаванасці пісанняў заходнерускай школы ў параўнанні з нацыянальнай беларускай гістарыяграфіяй.

Міфатворчасць прыхільнікам звышсучасных філасофскіх плыняў можа здавацца адсталасцю, але нельга забыцца, што міф моцны тым, што дае менавіта сістэмныя адказы. Дэканструкцыя міфаў без стварэння на іх месцы альтэрнатыўнай сістэмы — рэч безадказная, і калі нейкі даследчык яшчэ пачуваецца беларусам, ён абавязаны гэта ўлічваць.

Канструктыўная ўтопія — гэта не хлусня.

Гэта — надзея, гэта тое, чым кожнае грамадства, у тым ліку беларускае, жывіць свае асновы. Пра гэта нагадвае суб’ектам незалежнага мыслення супрацоўніца «СБ».

Мы — адзін народ (або, як ненавукова піша часам «Наша Ніва», адна нацыя). Злучаючы раздзеленае непераадольным часам, нарацыя «Гульні...» змушае прыгадаць і задумацца, што намі ўспадкавана ад якой лініі: што ад катаў, апантаных ідэямі «новага жыцця», што ад катаваных, пра ідэі якіх нам часам мала што вядома. Калі мы сапраўды адзін народ, то як узаемадзейнічаюць нагэтульки розныя складнікі? Раман амаль не адказвае на апошняе пытанне, але, як мне здаецца, нейкі адказ утрымліваецца ў завочным дыялогу Рублеўскай і Булгакава.

## Эстэтыка крыку

Калі ў справах невідавочных аўтарка «Гульні...» кажа шмат новых словаў, дык у відавочных выглядае сціпла. Здзек з беларускай мовы, нацыянальныя міфы Л.Рублеўская тлумачыць глыбока і нешаблонна, а карупцыя ў сучасным Мінску ў ейным апісанні выглядае як або татальна новае, або прынцыпова невытлумачальнае зло. Якая наіўнасць!

Увогуле, канфлікт у «Гульні...» будуецца на класічна рамантычны ўзор: прыроднае зло супраць прыроднага дабра.

Пісьменніца нагадвае сваіх герояў. Яна іншы раз так захапляецца разгортваннем дзеяння, што тчэ тэкст, як слуцкая ткачыха персідскі пас з васількамі.

Прыемна і радасна чытаць твор, які пісаўся ў гэткім узвышаным стане, але лепш бы доказы аўтаравай захопленасці былі менш гратэскнымі. Кардэ забіла Рабесп’ера... «Тужліва глядзеліся між учэпістых «плебеяў» яркія галоўкі туліпанаў ды хрызантэм» (курсівы мае — ДЖ)... Гэткія вынаходкі варта было б выявіць падчас рэдактуры-карэктуры, якою часопіс «Дзеяслоў» неабгрунтавана пагарджае. Агульнага ўражання драбяза не псуе, але ўвагу чытача непатрэбна адцягвае. Адцягванне ж для ўспрымання твору небяспечнае.

Бо «Гульня ў Альбарутэнію» — гэта крык. Хай сабе інтэлігенцка-стрыманы, жаноцка-інсцэнаваны і пісьменніцка-стылізаваны, але менавіта крык, і яго даводзіцца ўспрымаць як крык.

Пра што ж крык? Вядома, пра што: што жыве Беларусь. І крышку — пра тое, як ёй жывецца.

**P.S.** Кажуць, «Белсат» зняў «Тутэйшых». У мяне вестка для белсатаўскіх планавікоў: з’явіўся новы твор, экранізацыя якога можа дапамагчы вам у дасканаленні свайго майстэрства. Ну а дзеля павагі да паноўных законаў ідэалагічнага сюррэалізму варта бягучым радком пускаць па нізе экрану тэкст чарговага нумару «СБ»: ад назвы да рэдакцыйнага складу.

**Даніла Жукоўскі**

крытык, лаўрэат прэміі «ARCHE» «За сумленнае слова». Жыве ў Гродне. Аўтарская назва тэксту — «Права на надзею».




## ІМПРЭЗЫ

### Літаратурны фестываль Lesebühne Deutsch

**29 мая ў Доме дружбы (вул. Захарава, 28) а 18-й** — літаратурны фестываль Lesebühne Deutsch з удзелам Віктара Жыбуля і нямецкіх пісьменнікаў Філіпа Шарэнберга і Тобіаса Борке. «Lesebühne», альбо «літаратурная пляцоўка», — фармат літаратурнага мерапрыемства, які стаў любімым перш за ўсё ў Берліне. Lesebühne дае аўтарам сцэну, мікрафон і магчымасць асабіста прадставіць слухачам свае тэксты. Уваход вольны. Мерапрыемства праводзіцца з перакладам на беларускую мову.

### Аўдыёкніга Уладзіміра Караткевіча

Прэзентацыя аўдыёкнігі Уладзіміра Караткевіча «Каласы пад сярпом тваім» адбудзецца **28-га мая ў канферэнц-зале Абласной бібліятэкі імя А.Пушкіна (вул.Залатая Горка, 19)**. Таксама ў праграме прагляд дакументальнага фільму пра жыццё і творчасць Уладзіміра Караткевіча. Вядучы імпрэзы — мастацтвазнаўца Сяргей Харэўскі. **Пачатак а 18-й**, уваход вольны.

### Някляеў і Камоцкі ў Горках

**У Горках, у гісторыка-этнаграфічным музеі, 22 мая** адбудзецца сустрэча з паэтам Уладзімірам Някляевым і бардам Алесем Камоцкім. **Пачатак у 12.30.**

### Арлоў у Баранавічах

**У Баранавічах (вул.Камсамольская, 28-65) 30 мая** пройдзе сустрэча з Уладзімірам Арловым. Тэма гутаркі — «Мілавіды: змаганне за незалежнасць». **Пачатак а 16-й.**

### Прэзентацыя кнігі пра ўзброены супраціў

**21 мая а 18-й у Магілёве па адрасе зав.Чкалава, 16** адбудзецца прэзентацыя кнігі Ігара Пушкіна «Узброены супраціў ва Усходняй Беларусі (20—30-я гады XX ст.): дакументы і матэрыялы».




### Беланогая, Плясанаў, Мяльгуй і Мартыненка

Культавыя музычныя крытыкі Анатоль Мяльгуй і Вітаўт Мартыненка, а таксама барды Таццяна Беланогая і Андрэй Плясанаў едуць па краіне. **22 мая** яны сустрэнуцца з слухачамі **ў Брэсце (кафэ-бар «Вектар»,- вул. Маладагвардзейская, 14/1. Пачатак у 18.00)**. **24 мая** будуць **у Воршы (музей У.Караткевіча, вул. Леніна,26. 18.00)**, а **26 мая — у Гомелі (Управа АГП, вул. Палеская, 52. 18.00)**.

## КІНО

### Тыдзень ізраільскага кіно

**25 мая ў кінатэатры «Цэнтральны»** стартуе тыдзень ізраільскага кіно, які **працягнецца да 29 мая**. **25 і 26 мая — «Бофор»** (2007, ваенная драма пра вывад ізраільскіх войскаў з Лівану). **27 мая «Нініны трагедыі»** (2003, трагікамедыя). **28 мая «Джэні і Джэні»** (1997, дакументальная стужка пра адно лета з жыцця дзвюх стрыечніцаў). **«Першая Алімпіяда маёй маткі»** (1997, дакументальная стужка пра сляпачку, якая змагаецца за залаты медаль). **29 мая «Сябры Яны»** (1999, трагікамедыя пра выхадцаў з былога СССР).

## КАНЦЭРТЫ

### «Крама» ў Гродне

**4 чэрвеня ў Ліцэі №1 Гродна** — канцэрт «Крамы». **Пачатак а 19-й.**

### Зміцер Вайцюшкевіч

**2 чэрвеня ў «Графіці» (зав. Калініна, 16)** заспявае Зміцер Вайцюшкевіч. **Пачатак а 19-й.**

### Польскі джазмэн Павал Качмарчык

**27 мая ў Вялікай канцэртнай зале Белдзяржфілармоніі** — канцэрт Паўла Качмарчыка і яго Audiofeeling Band. Павал Качмарчык прыязджае ў Мінск з выдатнымі польскімі джазмэнамі, кожны з якіх з'яўляецца зоркай — саксафаніст Радэк Навіцкі, басіст Войцех Пульцын і барабаншчык Павел Дабравольскі. **Пачатак а 19-й.**



### Bela Music — 09

**23 мая ў 16.30 на аэрадроме «Баравая»** — фэст «Bela Music — 09». Бяруць удзел: **Neuro Dubel**, **«Палац»**, **Garadzkija**, **«Дзецідзяцей»**, **«J:морс»**, **«Без Білета»**, **«Крама»**, **Rastop Power Trio**.

### Garadzkija

**26 мая ў «Графіці» (зав. Калініна, 16)** — канцэрт Garadzkija. **Пачатак а 19-й.**

### Affabre concinui

**29 мая а 19-й у Рэспубліканскім палацы культуры прафсаюзаў** — канцэрт польскага вакальнага калектыву «Affabre concinui». У праграме: джазавыя кампазіцыі, класічныя і сучасныя творы, поп-хіты XX ст., аркестравыя працы, музычныя жарты. **30 мая — канцэрт у Архікатэдры імя Насвяцейшай Марыі Панны.** У праграме — музыка эпохі Адраджэння, страдаўняя рэлігійная польская і еўрапейская музыка. Вольны ўваход.

## ВЫСТАВЫ

### Калякі-малякі

**У гарадской галерэі твораў Л.Шчамялёва (пр.Ракасоўскага, 49)** працуе выстава твораў Кацярыны Рымашэўскай і Наталлі Мінчук «Калякі-малякі».

### Андрыян Жудро і Васіль Ясюк

**У музеі Беларускай акадэміі мастацтваў (вул.Сурганава, 14-а, 2-гі корпус) з 25 да 31 мая** сумесная выстава працаў ізраільскага мастака Андрыяна Жудро і беларускага мастака Васіля Ясюка.

### Выставы ў Палацы мастацтва

**Палац мастацтва (вул.Казлова, 3) запрашае да 31 мая** наведаць выставу жывапісу Віталя Цвірко, мастацкую выставу «Мастак і кніга» і фотавыставу «Адзін дзень у Чэшскай рэспубліцы».

## ТЭАТРЫ

### 21 мая

**Купалаўскі тэатр** — «Пінская шляхта»
**Тэатр юнага гледача** — «Бліндаж»
**Музычны тэатр** — «Шклянка вады»
**Тэатр імя Горкага** — «Дзядзюшкін сон»
**Тэатр лялек** — «Чайка. Спроба прачытанння»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Нязваны госць»

### 22 мая

**Купалаўскі тэатр** — «Таполевая завея»
**Купалаўскі тэатр** — «Дзікае паляванне караля Стаха» (Малая сцэна)
**Тэатр оперы і балету** — «Баядэрка»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Неба ў дыяментах»
**Тэатр імя Горкага** — «Валянцінаў дзень»
**Музычны тэатр** — «Марыца»

### 23 мая

**Купалаўскі тэатр** — «Вечар»
**Купалаўскі тэатр** — «Апельсінавае віно» (Малая сцэна)
**Музычны тэатр** — «Айбаліт-2002»
**Тэатр лялек** — «Чароўная лампа Аладына»
**Музычны тэатр** — «Бабскі бунт»
**Тэатр імя Горкага** — «Бег»

### 24 мая

**Купалаўскі тэатр** — «Прыгоды Заранкі і Янкі»
**Купалаўскі тэатр** — «Каханне ў стылі барока»
**Музычны тэатр** — «Прыгоды брэменскіх музыкаў»
**Тэатр лялек** — «Кот у ботах»
**Тэатр оперы і балету** — «Беласнежка і сем гномаў»
**Тэатр юнага гледача** — «Дзень народзінаў ката Леапольда»
**Музычны тэатр** — «Вясёлая ўдава»
**Тэатр імя Горкага** — «Бег»
**Тэатр оперы і балету** — «Лебядзінае возера»

### 25 мая

**Купалаўскі тэатр** — «Маці»
**Купалаўскі тэатр** — «Я не пакіну цябе»

### 26 мая

**Тэатр імя Горкага** — «Васа»
**Тэатр беларускай драматургіі** — Тэатр сучаснай харэаграфіі «D.O.Z.S.K.I»
**Музычны тэатр** — «Юнона і Авось»

### 27 мая

**Купалаўскі тэатр** — «Дамскае танга» (Малая сцэна)
**Купалаўскі тэатр** — «Дзеці Ванюшына»
**Тэатр імя Горкага** — «Анджэла і іншыя»
**Тэатр Беларускай арміі** — «Вераб'іная ноч»
**Музычны тэатр** — «Ноч у Венецыі»
**Тэатр оперы і балету** — «Карміна Бурана. Балеро»

### 28 мая

**Купалаўскі тэатр** — «С.В.»
**Музычны тэатр** — «Бабскі бунт»
**Тэатр імя Горкага** — «Жаніхі»

### 29 мая

**Купалаўскі тэатр** — «Сымон-музыка»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Ігвіта, альбо Як гэта рабілі ў Францыі»
**Тэатр імя Горкага** — «Праўда — добра, а шчасце — лепш»
**Музычны тэатр** — «Бабскі бунт»
**Тэатр оперы і балету** — «Спячая прыгажуня»

### 30 мая

**Купалаўскі тэатр** — «Вяселле»
**Музычны тэатр** — «Бураціна.by»
**Тэатр лялек** — «Васіліса Прыўкрасная»
**Музычны тэатр** — «Нябесны ціхаход»
**Тэатр імя Горкага** — «Легенда пра беднага д'ябла»

### 31 мая

**Купалаўскі тэатр** — «Вяселле»
**Тэатр лялек** — «Марозка»
**Музычны тэатр** — «Стойкі алавяны жаўнерык»
**Тэатр оперы і балету** — «Церам-церамок»
**Музычны тэатр** — «Дон Жуан у Севільі»
**Тэатр імя Горкага** — «Утаймаванне наравістай»

## КІНО НА ВЫХОДНЫЯ

# Зорны шлях

**Зорны шлях** (Star Trek)
ЗША, 2009, каляровы, 126 хв.
**Рэжысёр:** Дж.Дж.Абрамс
**Жанр:** Фантастыка, прыгоды
**Адзнака:** 6 (з 10)

«Аднойчы ў далёкай-далёкай Галактыцы віравалі…» — цьфу ты!

«У той час, як нашы касмічныя караблі рассякаюць …» — ізноў не тое, але ўжо лепей.

Хутчэй вось так: «Капітан, нас атакуюць! — Уключыць абарончы шчыт!»

Карціна «Зорны шлях» — пра прыгоды касмічнага карабля «Энтэрпрайз» у розных частках Сусвету, пра зухаватага камандзіра Джэймса Кірка і яго сябра Спока з планеты Вулкан — гэта не фільм. І нават не тэлесерыял, які з'явіўся ў 1966 г. у ЗША, быў перазняты, падоўжаны і паўтораны. Гэта касмічная мыльная опера. Толькі замест рабыняў Ізаўраў — зацягнутыя ў чырвонае сцюардэсы і зяленаскурыя спакусніцы. Замест знарочыстых нягоднікаў — бандыты з ускраінаў Галактыкі. Замест любоўных перашкодаў — языкастыя пачвары ледзяное планеты, вандроўкі ў часе і рукатворныя чорныя дзіркі.

Гэта шчаслівы аптымістычны космас, які не ведае пра люты холад Адысеі, не сутыкаўся з пакутамі на Салярысе і не прымушаў чалавека калаціцца ў самоце. Гэта космас абжыты, як суседская дзіцячая пляцоўка. Менавіта таму казка падасца знаёмай нават чалавеку, які пра яе нічога не чуў. На казачны паўтор працуюць дэкарацыі, фарбы, пазычаны з самага першага «Шляху» актор Леанард Німой.

Герояў казкі аддаю фанам. Зрэшты, рэжысёр Абрамс увёў і новых персанажаў — каларытны комік Сайман Пег у ролі навукоўца-разявы.




На міжнародным кінасайце «Зорны шлях» — у лідэрах. Але прайшоў ён не праз нашу Галактыку.

**Андрэй Расінскі**

# У мінскіх школах пачынаецца прыём у першыя класы

**Сем з іх прапануюць навучанне на беларускай мове. Падрабязная інфармацыя, адрасы і кантакты.**

### Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Гімназія № 4» (вул. Кунцаўшчына, 18)

20 траўня 2009 году а 18 гадзіне зладзіць Дзень адчыненых дзвярэй для бацькоў будучых першакласнікаў. У праграме — прэзентацыя гімназіі, сустрэча-знаёмства з настаўнікамі першых класаў, міні-канцэрт ды экскурсія па гімназіі.

Для прыёму дзяцей у першы клас іх законныя прадстаўнікі падаюць заяву на імя дырэктара гімназіі і прадстаўляюць копію пасведчання аб нараджэнні дзіцяці;

даведку аб стане здароўя дзіцяці (форма № 026-У), пашпарт бацькоў ці асобаў, што іх замяняюць, прад'яўляецца асабіста.

У перыяд ад 2 да 6 чэрвеня 2009 г. тут праводзяцца ўступныя іспыты ў гімназію (5 класы).

Даведка: e-mail: gymn4.minsk.edu.by, т.315-33-83, 258-49-71, 258-49-74.

Праезд аўтобусамі №29, 40, 78, 107, 116, 121 да прыпынку «вул. Матусевіча, 88», 17, 140, 30, 42 да прыпынку «26-ая паліклініка», тралейбусамі № 31, 9.

### Гімназія № 9 (вул. Сядых, 10)

арганізуе прыём дакументаў у 1 клас ад 01.06. да 28.08.2009 г.

Звяртацца трэба ў кабінет № 22. З сабой неабходна мець медыцынскую карту дзіцяці; пасведчанне і копію пасведчання аб нараджэнні; заяву аднаго з законных прадстаўнікоў дзіцяці; пашпарт з прапіскай ці від на жыхарства аднаго з законных прадстаўнікоў дзіцяці.

У наступным 2009/2010 навучальным годзе гімназія прапануе: вывучэнне ўсіх прадметаў на беларускай мове; вывучэнне англійскай, польскай, нямецкай моваў на факультатыўных занятках; вывучэнне прадметаў музычнай накіраванасці (хор, танец, сальфеджыо, музычная літаратура, ігра на музычных інструментах); дадатковыя адукацыйныя паслугі па запытах вучняў і бацькоў за кошт факультатыўных заняткаў і платных паслуг.

Тэлефоны для даведак: (017) 283-04-21 (дырэктар гімназіі Апалінская Ларыса Міхайлаўна), (017) 281-38-04 (наменік дырэктара па ВП Лаўрыновіч Валянціна Мікалаеўна)

**Заўвага:**

**У гімназію прымаюцца дзеці, якія пражываюць у г. Мінску.**

**Пры адсутнасці мінскай прапіскі неабходна ўзгадніць прыём дзіцяці ў гімназію з упраўленнем адукацыі адміністрацыі Першамайскага раёну г. Мінску.**

### У гімназіі № 23 (пр. Незалежнасці, 45)

камісія па прыёме дакументаў у 1 клас працуе па наступным графіку: у няцотныя дні (I змена) — 10.00—14.00, цотныя дні (II змена) — 15.00—19.00, у першую суботу чэрвеня — 10.00—12.00. Звяртацца ў каб.21.

Ад 11 мая 2009 г. у гімназіі №23 распачаўся прыём заяў ад законных прадстаўнікоў вучняў, якія заканчваюць 1-ю ступень агульнай сярэдняй адукацыі, для допуску да ўступных іспытаў у 5-я гімназічныя класы.

У перыяд ад 2 да 6 чэрвеня гэтага навучальнага году вучні здаюць тры ўступныя іспыты ў пісьмовай форме па наступных пісьмовых прадметах:

2 чэрвеня — Беларуская мова (дыктоўка)

4 чэрвеня — Матэматыка (кантрольная работа)

6 чэрвеня — Руская мова (дыктоўка)

Даведкі праз т.: (107) 284-51-26, 284-87-16.

Акрамя таго гімназія абвясціла дадатковы набор на вольныя вучнёўскія месцы ў 6 — 11-я класы.

Даведкі праз т.: (017) 284-47-62, 284-87-16

### У гімназіі № 28 (пр. Ракасоўскага, 93)

да 25 траўня працягваецца прыём заяваў ад бацькоў будучых першакласнікаў. Па інфармацыю можна звяртацца праз т.: (017) 248-32-02, 248-12-64 або напісаць на e-mail: sch2@minsk.edu.by. Прыём заяваў адбываецца на працягу працоўнага дня, у тым ліку і ў суботы. У перыяд з 2 па 6 чэрвеня гэтага навучальнага году адбудзецца здача ўступных іспытаў для вучняў , што пступаюць у 5-я гімназічныя класы. Іспыты адбудуцца ў пісьмовай форме па беларускай і рускай мовах, матэматыцы.

Гімназія № 28 прапануе выкладанне ўсіх прадметаў на роднай мове, а таксама паглыбленае вывучэнне французскай мовы, міжнародныя абмены, а таксама выкладанне прадметаў на французскай мове (краіназнаўства, літаратура Францыі) па праграмах, распрацаваных настаўнікамі школы

### Гімназія № 14 (вул. Васняцова, 10)

таксама прымае заявы ў беларускамоўныя 1 класы. Кантакты праз т.: (017) 295-01-33, 295-21-31.

Іспыты для выпускнікоў пачатковай школы тут адбудуцца ад 2 чэрвеня да 6 чэрвеня 2009 году. Прэтэндэнтам трэба будзе здаць пісьмовыя іспыты па беларускай і рускай мовах, матэматыцы.

Гімназія № 14 прапануе паглыбленае вывучэнне замежных моваў, спецкурсаў па міфалогіі, псіхалогіі, асновах эканамічных ведаў, журналістыцы і шмат іншага. На базе гімназіі дзейнічаюць фальклорны ансамбль, музеі, літаратурная студыя і студыя бальных танцаў.

### СШ №190 (вул.Нікіфарава, 19)

ажыццяўляе прыём дакументаў у першыя класы на 2009/2010 навучальны год ад 1 чэрвеня да 28 жніўня 2009 г. Бацькоў з дакументамі чакаюць у настаўніцкай (I паверх) у панядзелак (10.00—14.00), сераду (16.00-20.00), пятніцу (10.00-14.00), суботу (10.00-13.00). Выкладанне ў школе № 190 адбываецца на беларускай і рускай мовах. Школа прапануе таксама бясплатную музычную адукацыю і спартыўныя секцыі.

Даведкі: т. (017) 260-24-90; e-mail:sch190@minsk.edu.by

### СШ № 60 (вул. Лібкнехта, 82)

таксама чакае першакласнікаў у беларускія класы. Гэтая школа мае музычную скіраванасць. Звяртацца праз т.: (017) 208-69-74, 209-94-49.

**Сямён Печанко**

«БЕЛСАТ»: ТЭЛЕПРАГРАМА НА 25—31 МАЯ

# «Белсат» — гэта незалежны беларускі спадарожнікавы тэлеканал

### 25 мая, панядзелак

**18.00** Аб'ектыў (навіны, 1 выпуск)
**18.10** «Ранча», серыял: 29 серыя
**19.00** «Гісторыя пад знакам Пагоні»: «Кім была Еўфрасіння Полацкая?» (спазнаваўчая праграма)
**19.05** «Маці знядоленых», дак. фільм, рэж. Піна Катальда, Мікеле Шанкалепорэ, 2005 г., Італія
**20.00** Тыдзень з радыё «Свабода» (аналітычная праграма)
**20.30** «89 міліметраў ад Еўропы», рэпартаж, рэж. Марцэль Лазіньскі, 1993 г., Польшча
**20.40** «ЕС без сакрэтаў», 10 серыя: «Расія», ч. 2
*У чарговым фільме цыклу апавядаецца пра новы газаправод паміж гарадамі Гразявец і Выбарг, па якім расійскае паліва ідзе ў ЕС. Эксперты з ЕС дзеляцца меркаваннямі пра цяперашні стан сельскай гаспадаркі Расіі. Праграма падрыхтаваная на аснове матэрыялаў ад Еўрапейскай Камісіі.*
**21.00** Аб'ектыў (навіны, галоўны выпуск)
**21.20** Асабісты капітал (эканамічная праграма)
**21.35** «Мастацтва плакаць», маст. фільм, рэж. Пэтэр Скёнаў Фог, 2006 г., Данія.
**23.20** «Элі Макбіл», тэлесерыял: IV сезон, 22 серыя
**00.05** Аб'ектыў (навіны)

### 26 мая, аўторак

**18.00** Аб'ектыў (навіны, 1 выпуск)
**18.10** «Элі Макбіл», тэлесерыял: IV сезон, 22 серыя
**18.55** «Вароніна возера», дак. фільм, рэж. Інеса Курклієціце, 2007 г., Літва
**19.55** «Minsk–Mixt—2008», ч. 4: канцэрт гурту «Svet Boogie Band»
**20.15** «Акно ў Еўропу» (інфармацыйная праграма)
**20.40** Паштоўка з Вільні (праграма пра беларусаў у Літве)
**21.00** Аб'ектыў (навіны, галоўны выпуск)
**21.15** Маю права (прававая праграма)
**21.30** Форум (ток–шоу): Кватэрнае пытанне
*Адсутнасць даху над галавою стаецца крыніцаю шматлікіх праблемаў ужо цягам доўгіх дзесяцігоддзяў. Ні савецкая ўлада, ні цяперашняя так і не развязалі жыллёвага пытання, хоць і тая, і другая абяцалі гэта зрабіць. А тут на дадатак крызіс!.. Наколькі рэальна для сярэдняга беларуса купіць жытло?*
**22.20** Еўропа сёння (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»)
**22.50** Госць «Белсату»: Павал Мажэйка размаўляе з вядомымі экспертамі ды палітыкамі на найбольш актуальныя і гарачыя тэмы
**23.10** «Элі Макбіл», тэлесерыял: IV сезон, 23 серыя
**00.00** Аб'ектыў (навіны)

### 27 мая, серада

**18.00** Аб'ектыў (навіны, 1 выпуск)
**18.10** «Элі Макбіл», тэлесерыял: IV сезон, 23 серыя
**18.55** «Людзі старой веры», дак. фільм, 2008 г.
**19.20** Асабісты капітал (эканамічная праграма)
**19.35** «Апошні сезон», серыял: 4 серыя
**20.30** Праект «Будучыня» (навукова–папулярны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»)
**21.00** Аб'ектыў (навіны, галоўны выпуск)
**21.15** Рэпартэр (інфармацыйная праграма)
**21.35** «Гісторыя пад знакам Пагоні»: «Давыд Гарадзенскі», «Кім была Еўфрасіння Полацкая?» (спазнаваўчая праграма)
**21.50** «Кэдзі», маст. фільм, рэж. Доналд Кромбі, 1976 г., Аўстралія.
*У ліхія часы лёс жанчыны становіцца незайздросным. Асабліва ў гады Вялікай дэпрэсіі. Кэдзі, маці–адзіночка пры жывым мужы, застаецца адна з дзецьмі на руках. Яна спрабуе выжыць у складаных умовах і знайсці свой шлях да шчасця.*
**23.35** З архіву «Jazz Jamboree»: «Гіл Эванз Оркестра», ч. 2.
**00.05** Аб'ектыў (навіны)

### 28 мая, чацвер

**18.00** Аб'ектыў (навіны, 1 выпуск)
**18.10** «Кэдзі», маст. фільм, рэж. Доналд Кромбі, 1976 г., Аўстралія.
**20.00** Невядомая Беларусь: «Гуканне вясны», дак. фільм, рэж. Зоя Катовіч, 2009 г., Беларусь
**20.30** На колах (аўтамабільны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»)
**21.00** Аб'ектыў (навіны, галоўны выпуск)
**21.15** Сальда (эканамічная праграма)
**21.30** Дакументальная гадзіна: «Слёзы Шахеразады», дак. фільм, рэж. Егуда Джад Нэман, 2006 г., Ізраіль
**22.55** «Кансультацыя ў ружовым садзе», серыял: 8 серыя
**23.45** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы (сатырычная праграма)
**00.00** Аб'ектыў (навіны)

### 29 мая, пятніца

**18.00** Аб'ектыў (навіны, 1 выпуск)
**18.10** «Кансультацыя ў ружовым садзе», серыял: 8 серыя
**19.00** Праект «Будучыня» (навукова–папулярны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»)
**19.30** «Троіца», фільм–канцэрт
**20.10** Рэпартэр (публіцыстычная праграма)
**20.40** Кінастужка (агляд кінарынку)
**21.00** Аб'ектыў (навіны, галоўны выпуск)
**21.15** Госць «Белсату»
**21.30** «Герой году», маст. фільм, рэж. Фелікс Фальк, 1986 г., Польшча.
*Польшча сярэдзіны 1980–х. Час пераменаў у грамадстве і свядомасці людзей. Шоумен Лютэк Даніеляк, вядоўца «Сустрэчаў з Героем году», дзеля падтрымання цікавасці публікі і кіраўніцтва да свайго праекту ідзе на любыя інтрыгі. Нават спрабуе ўцягнуць у даволі непрыстойную справу каханую дзяўчыну.*
**23.25** «Апошні сезон», серыял: 5 серыя
**00.15** Аб'ектыў (навіны)

### 30 мая, субота

**18.00** Аб'ектыў (навіны, 1 выпуск)
**18.10** Тыдзень з радыё «Свабода» (аналітычная праграма)
**18.40** «Усяго найлепшага!», дак. фільм, рэж. Роберт Латакаш, 2008 г., Венгрыя—Аўстрыя—Нямеччына
*Двое сяброў з Трансільваніі (венгерскай часткі Румыніі), Лары і Лоры, падарожнічаюць па Еўропе. Фільм–разважанне пра сяброўства, пошук свайго месца ў сучасным свеце, пра адрозненні паміж Усходам і Захадам. Але галоўная тэма — месца цыганоў у сённяшняй Еўропе.*
**20.05** На колах (аўтамабільны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»)
**20.35** Кухня (музычна–публіцыстычная праграма)
**21.00** Аб'ектыў (навіны, галоўны выпуск)
**21.10** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «Дарога праз стэпы між аазісаў», дак. фільм, 2007 г., Японія
**22.10** Еўропа сёння (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»)
**22.35** Суботні сеанс: «Кошт яе раману», трымценнік, рэж. Джон Пэтэрсан, 1996 г., ЗША.
*У Джэфа Дантэ — студэнта англійскай літаратуры — гіне каханая Эн. Ён пераводзіцца ў іншы універсітэт, дзе працягвае вывучаць Шэкспіра і спасцігаць жарсці яго п'есаў на ўласным жыцці. Неспадзявана Джэф закахаўся ў сваю выкладчыцу Даяну, стомленую жыццём жанчыну. Завязваецца кароткі і бурлівы раман. Высвятляецца, што папярэдняя каханка Джэфа, якая загінула пры нявысветленых акалічнасцях, таксама была выкладчыцаю англійскай літаратуры. Даяна разумее, што за раман з Джэфам ёй давядзецца дорага заплаціць.*
**00.05** Аб'ектыў (навіны)

### 31 мая, нядзеля

**18.00** Прэс–экспрэс (агляд медыяў)
**18.15** «Ранча», серыял: 30 серыя
**19.05** «Бульбаны», мультсерыял
**19.15** «Белы тэрор», дак. фільм, 2006 г., Францыя
*З 1990–х у Еўропе назіраецца трывожны рост папулярнасці крайне правых партыяў, што суправаджаецца павелічэннем шэрагаў неанацысцкіх груповак. Швецыя стала найбуйнейшым еўрапейскім вытворцам агітацыйных матэрыялаў на відэакасетах і DVD. У Швецыі самыя ліберальныя законы і добрыя тэхнічныя ўмовы для такой вытворчасці. Праз канцэрты гуртоў адпаведнага ідэалагічнага кірунку неанацысты прыцягваюць маладых людзей, якія лёгка паддаюцца апрацоўцы. На жаль, большасць грамадства ігнаруе гэтую трывожную з'яву. І пагроза прыходу «ўнукаў» Гітлера да ўлады ўжо не выглядае такою прывіднаю...*
**20.10** Форум (ток–шоу): Кватэрнае пытанне
**21.00** Аб'ектыў (вынікі тыдня)
**21.20** «Гісторыя пад знакам Пагоні»: «Кім быў Кірыла Тураўскі?» (спазнаваўчая праграма)
*Хаця пра тураўскага Залатаслова, як называлі яго сучаснікі, нам вядома няшмат, затое да нас дайшла амаль неверагодная для аўтара XII ст. колькасць ягоных твораў — пропаведзяў, прыпавесцяў, малітваў, павучанняў, канонаў. Яны адлюстроўваюць натуральнае чалавечае захапленне харавством прыроды, вызначаюцца багатаю паэтычнаю вобразнасцю, узнёсласцю. Вялікі гуманіст старажытнасці, Кірыла Тураўскі — сімвал таленту нашага народу, яркае сведчанне глыбіні каранёў нашае культуры.*
**21.25** «Акно ў Еўропу» (інфармацыйная праграма)
**21.50** Фільматэка майстроў: «Знакамітасць», маст. фільм, рэж. Вудзі Ален, 1998 г., ЗША.
*Як і шэраг іншых стужак славутага рэжысёра Вудзі Алена, гэта дасціпная пародыя на амерыканскія тусоўкі 1970–х. Здымаецца блакбастэр «Ліквідатар». Лі Сайману — рэпарцёру сярэдняга часопісу — трэба ўзяць інтэрв'ю ў галоўнай гераіні, вядомай актрысы Ніколь Олівер. Мімаходзь Сайман знаёміцца з дзяўчынаю сваёй мары, акторкаю з масоўкі Нолаю. Сайману 40 гадоў, ён нядаўна разжаніўся і сыты папярэдняй сувяззю па горла. Ён хоча пачаць усё нанова: дапісаць геніяльны раман, прадаць сцэнар, знайсці новую жанчыну. Аднак наваколны свет не такі просты...*
**23.45** «Дарога на Вільню», дак. фільм, 2008 г., Беларусь
**00.05** Аб'ектыў (вынікі тыдня)



ЛЕВЫМ ВОКАМ



# У кіпцюрах скандынаваў

**«Наш хлопец», «беларускі спявак» — гэтыя і іншыя эпітэты на адрас Рыбака з боку беларускіх медыяў абавязкова маюць зацікавіць спецслужбы Нарвегіі. Фельетон Лёліка Ушкіна.**

У казематах нарвежскай Амерыканкі і так няўтульна: цемра, пацукі, зладзеі ў законе, якія не гавораць па-нашаму. А калі цябе пры гэтым катуюць песнямі Кіркорава, увогуле жэсць. Гэтыя невясёлыя думкі лезлі ў галаву экс-кіраўніку беларускай дэлегацыі на Еўрабачанні ў той час, калі нарвежскі спецслужбіст наводзіў на ягоны твар прамень юпітэра.

— Ну, што: будзеш гуляць у маўчанку? Яшчэ раз паўтараю пытанне: дзе і калі вы завербавалі Рыбака? Яўкі, паролі, мянушкі?

— Не разумею, пра што вы, — прамямліў кіраўнік, спрабуючы адвесці твар ад рэзкага святла. — Я патрабую адваката. Вы нарываецеся на скандал. Я заслужаны народны артыст...

— Ах, ты не ведаеш? А хто называў Рыбака «наш хлопец»?!

Пасля гэтай фразы вікінг дабавіў яшчэ кіркораўскіх дэцыбелаў. Ад эстэтычнага шоку прымадон беларускай эстрады страціў прытомнасць.

— Свенсан, колькі разоў я табе казаў — не перабірай. Лепей ужо селядцом біць, чым гэтак. І слядоў не застаецца, — пракаментаваў інцыдэнт іншы афіцэр, які знаходзіўся ў пакоі.

Падследны прыходзіў да цямы. Скарыстаўшыся перапынкам, ён разважаў. А сапраўды, а што яму свеціць, калі будзе ўсё тупа адмаўляць? Яшчэ пару тыдняў патрымаюць, а потым адцягнуць у нейкі фіёрд і, як там спявала іхняя ABBA: «Сэнк ю фо зэ м'юзік». Наўрад ці пра яго геройскі чын успомняць на радзіме...

А ў выпадку калабарацыі, пацягнулася далей нітачка разважанняў, перад ім адчыняюцца шалёныя перспектывы. Спачатку, праўда, хутчэй за ўсё ён будзе служыць звычайным паліцаем. Аднак нават тут ёсць прастора для творчай самадзейнасці. У свядомасці артыста паўставалі захапляльныя малюнкі: вось ён стварае ВІА «Паліцэйскія верасы», вось іх хіт «Матка, яйкі» штурмуе рэйтынгі MTV, вось ён на пляжы Малібу з Брытні Спірс...

Ролік фантазій перарараваў рык ката: дык што, будзем калоцца?

— Добра, я ўсё скажу. Толькі музыку выключыце. Значыць так: Рыбака мы завербавалі, калі ён яшчэ ў мінскі садзік хадзіў. Ён ужо тады быў да мозгу костак фанатычным нашым хлопцам. У сакрэтных файлах ён праходзіць пад мянушкай «Эскімо».

Нарвежцы кінуліся запісваць лабуду, якую ім штурхаў падследны.

— А як ён перадае вам інфармацыю? Прозвішча беларускай піяністкі?

Даводзілася гальванізаваць фантазію:

— Нам не патрэбная піяністка. Ён усё перадае проста са сцэны, калі на скрыпцы грае: там кожная нота — гэта зашыфраваная літара.

Нарвежскія чэкісты афігелі ад прафесіяналізму беларускіх калегаў, пакідалі асадкі і блакноты. У гэты момант яны адчувалі сябе поўнымі калхазанамі.

— Добра, — усё, што мог выціснуць той, якога звалі Свенсан. — Напішыце нам код шыфру і можаце ісці.

— Служу каралю Олафу трынаццатаму! — бадзёра сказаў экс-кіраўнік і запісаў на паперцы бас-партытуру да песні «Малінаўка».

Афіцэры кінуліся расшыфроўваць пасланне агента Рыбака, перададзенае праз песню Fairy tale на Еўрабачанні.

Выйшла наступнае: «перадайце Вяргейчыку, каб Макаўчыка больш на поле не выпускаў. Зноў аблажаемся, як тады, з ФК «Мінск».



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Мы — беларусы, мірныя людзі. У Мінску пачалася выстава ўзбраення і вайсковай тэхнікі Milex-2009. Старонка 3.**

## «НН» СТО ГАДОЎ З ВАМІ

**Пецярбург.** Судзілі былога дырэктара дэпартамента паліцыі А.Лапухіна; віна яго была ў тым, што ён адкрыў рэвалюцыянерам правакатарства Азэфа. Першы стаў вінаваціць Азэфа ў здрадзе Бурцаў. Тады ўсе таварышы на яго напалі, каб ён даводзіў акуратна, што Азэф здрайца, бо інакш яму прыйдзецца цяжка адпакутаваць (налажыць на сябе рукі). Бурцаў звярнуўся да Лапухіна, Лапухін сказаў, што Азэф служыць у паліцыі.

Рэвалюцыянеры зрабілі ў Парыжы суд над Азэфам. Калі правіцельства даведалася, Лапухіна арыштавалі. Калі Бурцаў спытаўся аб Азэфе (ад гэтай справы залежала жыццё Бурцава), Лапухін, як справядлівы чалавек, не мог браць на сваё сумленне людскога жыцця і сказаў праўду. Лапухін ніколі не гадзіўся на тое, што робяць рэвалюцыянеры, але гэтак зрабіў толькі паводлуг сумлення свайго. Суд прыгаварыў сасласць яго ў катаргу на 5 гадоў, пазбавіць маёнткаў і ўсіх чыноў і правоў.

**«Наша Ніва». №19. 1909**

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### ВІТАННІ

**Віншуем з надыходзячым юбілеем** выдатнага гісторыка і чалавека Алеся Смаленчука! Жадаем моцнага здароўя, вытрымкі, аптымізму! Чакаем новых захапляльных кніг! Сябры абласной Рады Гарадзенскага ТБМ

**Рух «За Свабоду»** віншуе рэгіянальнага дэмакратычнага лідэра, адраджэнца і рэжысёра Хрыстафора Жэляпава з Народзінамі!

**Віншуем Насту Базар-Хоміч і Дзяніса Хоміча** з нараджэннем дачушкі Мілаславы. Жадаем падрослай сямейцы шчасця! Печанкі

### МАНЕЖ І ВАЗОК

**У Ждановіцкім доме-інтэрнаце** выхоўваецца 3-гадовая Юля, якая пакутуе на ДзЦП. Дзяўчынцы трэба манеж і вазок для прагулак. Можна ўжываныя. Калі можаце падарыць ёй гэтыя рэчы, калі ласка, зрабіце гэта! Т.: (017) 509-60-88

### ПРАЦОЎНАЯ ГРУПА

**Утвараецца працоўная група** для складання іспанска-беларускага, беларуска-іспанскага слоўніка. Зацікаўленых просім звяртацца праз т.: (029) 629-92-22 або на u_dziadow@yahoo.com (Уладзімір Дзядоў)

### КОЗЫ

**Прадам** 2 казы. Т.: (017) 212-35-44

### ПРАЦА

**Шукаю сталую працу** рэдактара ці стыль-рэдактара. Стаж — шэсць гадоў. Т.: 286-45-73, (044)704-82-71. Эдвард

### СЯБРОЎСКАЕ ПАДАРОЖЖА

**Антон Астаповіч 31 траўня запрашае** ў краязнаўчае падарожжа ў Паазер'е, па маршруце Мінск — Глыбокае — Гатаўшчына — Задарожжа — Гарадзец — Лужкі — Германавічы — Мінск. Кантакты: (017) 262-73-43, (029) 111-73-32

## СТОП-КАДР




**Якія варыянты расшыфроўкі «Б»?**

**Прыватныя абвесткі ў «НН»**
(не больш за 15 словаў) можна падаць бясплатна. Дасылайце поштай (а/с 537, 220050, Мінск) ці праз e-mail (nn@nn.by) або размяшчайце на форуме сайту www.nn.by. Дык скарыстайцеся!

## ЖАРТЫ

* * *

Нямногія ведаюць, што краты вераць у Вялікага Дачніка. Бо менавіта ён пасылае ім увесну бульбу з нябёсаў.

* * *

Дзіўная істота чалавек... Ён лёгка пераносіць дрэннае жыццё і цяжка пераносіць добрае. Асабліва, калі пры дрэнным жыцці многім яшчэ горай, а пры добрым некаму яшчэ лепей.

**Наша Ніва**
незалежная газета

заснаваная ў 1906, аднаўленая ў 1991

**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

| | |
|---|---|
| сакратарка рэдакцыі | Наста Бакшанская |
| шэф-рэдактар | Андрэй Дынько |
| галоўны рэдактар | Андрэй Генадзевіч Скурко |
| мастацкі рэдактар | Сяргей Харэўскі |
| заснавальнік | Мясцовы фонд выдання газеты «Наша Ніва» |
| выдавец | Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы» |

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Мінск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА**.
Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 12 палос фарматам A2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасці за змест рэкламных абвестак. Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №581 ад 14 сакавіка 2007 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Мінск, пр. Ракасоўскага, 102-71. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Мінск, код 764.

Наклад 5715. Газета выдаецца 48 разоў на год.
Нумар падпісаны ў друк 23.00 20.05.2009.
Замова № 2654.
Рэдакцыйны адрас: Ракасоўскага, 102-71.
Цана дамоўная.
ISSN 1819 1614

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12